Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

30 жніўня 2023 г.
СЕРАДА
№ 167 (30047)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

АДУКАЦЫЯ З УХІЛАМ У ЗАЎТРА

ПОПЫТ НА РАБОЧЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:

«Бюджэт на 2024 год сфарміраваны зыходзячы з прагнознага сцэнарыя (тэмп росту ВУП — 103,8 %), захавана яго сацыяльная накіраванасць. Аб'ём фінансавання сацыяльнай сферы павялічваецца на 12 % да ацэнкі бягучага года. Амаль на Br1,5 млрд вырастуць расходы на адукацыю, на Br1,2 млрд — на ахову здароўя. На 12,6 % будуць павялічаны расходы на аплату працы ў бюджэтнай сферы. На выплату сацыяльных дапамог — на 14 %, пенсій — на 16 %. Будзе аказана неабходная падтрымка ў субсідзіраванні будаўніцтва жылля для маладых і шматдзетных сем'яў і іншых катэгорый грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, а таксама інжынерна-транспартнай і іншай інфраструктуры да раёнаў забудовы. На гэтыя мэты ў бюджэце прадугледжана Br1,7 млрд (106 % да ацэнкі бягучага года).

На вернасць Радзіме і народу

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Упершыню ў адным страі клятву на вернасць Радзіме і беларускаму народу вымавілі курсанты Акадэміі МУС і Магілёўскага інстытута МУС, навучэнцы Ліцэя МУС. Урачысты рытуал прыняцця Прысягі адбыўся на плошчы Дзяржаўнага сцяга. Сваё жыццё з органамі ўнутраных спраў мараць звязаць і дзяўчаты. Адна з іх — бабруйчанка Арына КУКУШКІНА *(на фота)* — паступіла на крымінальна-выканаўчы факультэт Акадэміі МУС. З першых дзён навучання ў ведамасных ВНУ маладыя людзі спрычыняюцца да міліцэйскіх традыцый. Сімвалічна, што ў такі знакавы дзень курсанты і ліцэісты сталі сведкамі не менш урачыстай цырымоніі — ушанавання сцяга Міністэрства ўнутраных спраў, якую правёў кіраўнік міліцэйскага ведамства Іван Кубракоў.

Камунальныя стасункі

КАНАЛЫ ПРАЧЫШЧАНЫ, ПАШПАРТЫ АТРЫМАНЫ

Як сталічнае жыллё падрыхтавана да зімы, расказалі эксперты

Фота Ірыны СІДАРОК.

Планавыя работы па капітальным і бягучым рамонтах жылля, тэхабслугоўванні і замене абсталявання працягваюцца ў Мінску. Да 15 верасня сістэмы ацяплення сталіцы запоўняцца цеплакрыніцамі (вадой), рамонт дахаў плануюць скончыць да 30 верасня, а да кастрычніка — нарыхтаваць неабходны аб'ём супрацьгалалёдных матэрыялаў, тэхнікі і абсталявання. Да канца года «Мінскводаканал» павінен замяніць запланаваны на сёлета аб'ём сетак водазабеспячэння і водаадвядзення.

ГІДРАПНЕЎМАПРАМЫЎКА, ЦЕПЛАРЭАБІЛІТАЦЫЯ, КАПРАМОНТ

Падрыхтоўка жыллёвага фонду да асенне-зімовых умоў пачалася адразу пасля завяршэння папярэдняга ацяпляльнага перыяду. Былі сфарміраваны графікі планавых прафілактычных работ, якія выконваліся летам і працягваюцца цяпер, расказаў **Андрэй НОВІК, намеснік генеральнага дырэктара Мінскай жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

— «Мінскводаканал» замяніў больш за 17 кіламетраў сетак водазабеспячэння і звыш 24 кіламетраў сетак водаадвядзення. Прафілактычны агляд артэзіянскіх свідравін выкананы на 81 %, прафілактычнае абслугоўванне водаразборных калонак — на 88 %. На 114 % адрамантаваны калонкі і на 100 % — пажарныя гідранты.

СТАР. 3

ЖЫЦЦЁ ДЗЯЦЕЙ — У РУКАХ ДАРОСЛЫХ

Парады ратавальнікаў перад новым навучальным годам

Нягледзячы на тое, што на парозе — новы навучальны год і дзеці вернуцца ў свае калектывы, бацькам не варта самазаспакойвацца. Клапоцячыся, каб набыць свайму дзіцяці ранец і канцылярскія прылады, апрануць у самую прыгожую форму і запісаць на найбольш перспектыўныя гурткі, дарослыя павінны не ўпусціць самае галоўнае — бяспеку сваіх нашчадкаў. Перакладаць адказнасць за ўласных дзяцей на выхавацеляў і настаўнікаў, а дома пакідаць малых без нагляду — рызыка страціць самае дарагое, што ў вас ёсць...

БЯСЦЭННЫ БАГАЖ ВЕДАЎ

21 жніўня ў краіне стартавала інфармацыйна-прапагандысцкая кампанія «У цэнтры ўвагі — дзеці!», якая працягнецца да 15 верасня. Мэта акцыі — прыцягнуць увагу грамадскасці да праблемы дзіцячай гібелі і траўматызму ад пажараў з прычыны пакідання дзяцей без нагляду.

Першы этап праходзіць з 21 да 31 жніўня. Мэтавай аўдыторыяй, з якой актыўна працуюць прапагандысты МНС, з'яўляюцца бацькі, а месцамі для размовы з імі — гандлёвыя пляцоўкі. У аддзелах з дзіцячым адзеннем у буйных гандлёвых цэнтрах і іншых аб'ектах гандлю на манекенах або вешалках пакупнікі маглі заўважыць камплекты дзіцячага баявога адзення ратавальніка.

СТАР. 4

КАРОТКА

- Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб мерах па процідзеянні несанкцыянаваным плацежным аперацыям.
- **Уборка збожжавых культур завершана ў Мінскай вобласці.**
- «Дон Кіхот» і «Севільскі цырульнік» адкрыюць новы сезон у Вялікім тэатры Беларусі.

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Рухацца прымушае час»

Аляксандр Лукашэнка вызначыў асноўныя кірункі супрацоўніцтва з Тамбоўскай вобласцю

Беларусь з'яўляецца адным з галоўных гандлёвых партнёраў гэтага расійскага рэгіёна. Летась узаемны тавараабарот дасягнуў амаль 178 мільёнаў долараў. Гэта найлепшы вынік за апошнія пяць гадоў. На дасягнутым спыняцца ніхто не збіраецца. У планах — развіццё сумесных праектаў і прамысловай кааперацыі. Канкрэтныя прапановы дэлегацыя Тамбоўскай вобласці на чале з губернатарам Максімам Ягоравым прывезла ў Палац Незалежнасці.

На пачатку сустрэчы кіраўнік дзяржавы заўважыў, што Максім Ягораў ужо не раз бываў у Беларусі, а таму добра знаёмы з нашай краінай. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў абмеркаваць галоўныя кірункі ўзаемадзеяння, паглядзець, дзе ёсць недапрацоўкі, а самае галоўнае — што трэба зрабіць для таго, каб далейшае супрацоўніцтва было яшчэ больш эфектыўным.

ПАСТАЎКІ БЕЛАРУСКАЙ ТЭХНІКІ

Прэзідэнту дакладваюць, што ў 2022 годзе дасягнуты найвышэйшы вынік ва ўзаемным гандлі з Тамбоўскай вобласцю, пачынаючы з 2017 года, — каля 180 мільёнаў долараў (рост прыкладна на 80 %). Аднак гэтыя паказчыкі, па меркаванні беларускага лідара, невялікія, нават па мерках асобна ўзятага рэгіёна, таму супрацоўніцтва патрэбна падымаць на больш высокі ўзровень.

У гэтай сувязі Аляксандр Лукашэнка бачыць найбольш перспектыўныя кірункі. Па-першае, пастаўкі беларускай грузавой, камунальнай і дарожнабудаўнічай тэхнікі, ліфтавага абсталявання. «Усё, што датычыцца тэхнікі, мы можам стварыць і задаволіць патрэбы вашай вобласці, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — Гатовы пастаўляць таксама пасажырскую тэхніку, у тым ліку аўтобусы на газаматорным паліве, тралейбусы, электробусы з патрэбнымі характарыстыкамі».

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны, што прадстаўнікі дэлегацыі Тамбоўскай вобласці наведалі Мінскі трактарны і Мінскі аўтамабільны заводы, дзе прадметна азнаёміліся з прадукцыяй прадпрыемстваў, якія з'яўляюцца флагманамі айчыннай прамысловасці. У праграме візіту таксама запланавана наведванне такіх прадпрыемстваў, як «Белкамунмаш» і «Амкадор».

«Мы таксама можам пастаўляць вам трактары, камбайны, іншую тэхніку ў неабходных вам аб'ёмах», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да губернатара Тамбоўскай вобласці.

СУМЕСНЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ

Другі кірунак узаемадзеяння, які лічыць перспектыўным Прэзідэнт, — пераход ад простага тавараабмену да развіцця вытворча-кааперацыйнага супрацоўніцтва, канцэнтрацыя намаганняў на імпартазамяшчэнні. Рухацца ў такім напрамку, як заўважае беларускі лідар, прымушае час. Гэта, па яго словах, дазволіць забяспечыць тэхналагічную незалежнасць і бяспеку.

Пасля сустрэчы з паслом Беларусі ў Расійскай Федэрацыі ў красавіку бягучага года Максім Ягораў прапанаваў беларускаму боку выторкніны плошчы акцыянернага таварыства «Тамбоўспецмаш» для рэалізацыі сумесных кааперацыйных праектаў. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, якую сельгастэхніку тамбоўскія спецыялісты разам з беларускімі майстрамі хацелі б вырабляць на гэтым прадпрыемстве. Таксама кіраўнік дзяржавы ўдакладніў, ці ёсць ужо пэўныя вынікі гэтай працы, што яшчэ трэба зрабіць і што будзе рабіцца далей. Пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка і наяўнасцю праблем, якія патрабуюць вырашэння на ўзроўні кіраўніка дзяржавы.

АБМЕН ВОПЫТАМ У АПК

— Мы можам аказаць практычную дапамогу ў будаўніцтве, у тым ліку збожжа- і сховішчаў для агародніны, пастаўках абсталявання для малочнатаварных ферм, — агучыў беларускі лідар трэці кірунак супрацоўніцтва. — Ведаю, што край вельмі развіты ў гэтых адносінах, вы ўдзяляеце гэтаму вялікую ўвагу. Нашы прапановы вам накіраваны. Калі вы гатовы, мы хацелі б, каб вы нам прапанавалі сустрэчныя крокі і далі адказ, ці будзем мы ў гэтым кірунку працаваць.

Вельмі карысным, на думку кіраўніка дзяржавы, будзе абмен вопытам у галіне сучасных агратэхналогій і перапрацоўкі сельгаспрадукцыі, па пытаннях селекцыйнай работы, племянной справы, падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для аграпрамысловага комплексу.

БУДАЎНІЦТВА

Чацвёрты прыярытэтны кірунак двухбаковага ўзаемадзеяння — будоўля. Як дакладваюць Прэзідэнту, у гэтай сферы ёсць некаторае тармажэнне. «Гэтая тэма важная для насельніцтва, бо напрамую ўплывае на якасць жыцця людзей, — перакананы Аляксандр Лукашэнка. — Калі вы маеце патрэбу ў прафесійнай падтрымцы нашых будаўнікоў, то можаце на нас разлічваць».

Як паведаміў кіраўнік дзяржавы, Беларусь таксама гатова да актывізацыі сумеснай работы па тамбоўскім праекце «Чыстая вада» з прымяненнем сучасных тэхналогій і абсталявання для водаачысткі і водаадвядзення.

ГУМАНІТАРНАЯ СФЕРА

Аляксандр Лукашэнка абазначыў толькі асноўныя кірункі супрацоўніцтва. «Гэта далёка не поўны пералік пытанняў, якія могуць быць цікавыя і для Тамбоўскай вобласці, і для Беларусі, — удакладніў ён. — Займаючыся эканомікай, нам не варта забывацца і пра студэнцкія і школьныя абмены, ахову здароўя, навуку і адукацыю, культуру і турызм — тое, што называецца гуманітарнай сферай».

Гэта, па словах беларускага лідара, тыя самыя злучальныя звёны, якія дапамагаюць бакам лепш даведацца адзін пра аднаго. Асабліва, на думку Прэзідэнта, яны важныя для выхавання сучаснай моладзі. «Найважнейшае пытанне: што ў Расіі, што ў нас», — канкрэтызаваў Прэзідэнт і запэўніў, што тыя дамоўленасці, аб якіх ішла гаворка падчас рабочай сустрэчы, а таксама прынятыя рашэнні, беларускі бок будзе свята выконваць.

Вераніка КАНЮТА.

❍ У тэму

«ТОЕ, ШТО НАМЕЦІЛІ, БУДЗЕМ АЖЫЦЦЯЎЛЯЦЬ»

У размове з журналістамі **губернатар Тамбоўскай вобласці Максім ЯГОРАЎ** расказаў, што вялікая колькасць беларускай тэхнікі працуе на палях гэтага расійскага рэгіёна. «Калі многія вытворцы з так званым сусветным імем сышлі і перасталі эксплуатаваць тэхніку, якая была набыта раней, мы глядзім у бок Беларусі, — адзначыў ён. — Упэўнены, што ўнікальныя прадпрыемствы, якія ствараліся яшчэ ў савецкія часы вялікай кааперацыяй шматлікіх рэгіёнаў краіны, змогуць задаволіць гэты запыт. Мы прагаворваем пакупкі аўтобусаў, сельскагаспадарчай і камунальнай тэхнікі».

Губернатар расказаў, што падчас сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам ішла размова аб лакалізацыі вытворчасці беларускай тэхнікі ў Тамбоўскай вобласці. «Пачынаць трэба чым хутчэй, тым лепш, — заўважыў ён. — У нас выдатнае ўзаемаразуменне з вашымі міністэрствамі, мы на адной хвалі. Мы — братэрскія народы. Тое, што намецілі, будзем выконваць і ажыццяўляць».

Тамбоўскай вобласці таксама цікава супрацоўніцтва ў сферы беспілотнай авіяцыі. «Учора быў пробны візіт, абмеркаванне, — увёў у дэталі губернатар. — У нас у Тамбоўскай вобласці дастаткова вялікая колькасць прадпрыемстваў, якія займаюцца беспілотнай авіяцыяй для аграрыяў. Ёсць над чым працаваць. Ёсць цікавыя напрацоўкі ў Беларусі, ёсць у нас».

Максім Ягораў заўважыў, што ў Расіі запускаецца нацыянальны праект па беспілотных лятальных апаратах, і вобласць са сваімі вытворчасцямі разлічвае ў яго трапіць. Беспілотнікі можна будзе выкарыстоўваць для маніторынгу сельгасугоддзяў, унясення ўгнаенняў. Цікавасць таксама ёсць да беспілотных сістэм у частцы кіравання сельгастэхнікай, аб чым ішла размова падчас наведвання расійскай дэлегацыяй Мінскага трактарнага завода.

У якасці кіраўніка Тамбоўскай вобласці Максім Ягораў наведвае Беларусь упершыню, але ў прыватным парадку бываў у нашай краіне не раз. Журналісты папрасілі губернатара падзяліцца сваімі ўражаннямі аб Беларусі. «Заўсёды здзіўляла якасць аўтамабільных дарог, — адзначыў ён. — Тое, што ўсе трасы вынесены за межы населеных пунктаў, — гэта, вядома, бяспека для насельніцтва і бяспека дарожнага руху. У вас выдатныя аб'екты культурнай спадчыны. Я практычна ўсе замкі аб'ехаў у далёкім 2014 годзе. Вядома, добрыя музеі».

Асобна кіраўнік расійскага рэгіёна спыніўся на экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Прадстаўнікі дэлегацыі былі настолькі ўражаны ўбачаным, што ў найбліжэйшы час у Мінск прыедуць тамбоўскія школьнікі і студэнты, якія, на думку губернатара, таксама павінны азнаёміцца з трагедыяй, якую беларускі народ перажыў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

ПРЫБАЎКА ДА ЗАРПЛАТ БЮДЖЭТНІКАЎ І РОСТ ПРАЦОЎНЫХ ПЕНСІЙ

Што зменіцца з 1 верасня

З першага верасня павялічваецца базавая стаўка і многія могуць разлічваць на павышэнне заработнай платы. У тым ліку настаўнікі, для якіх перагледжаны памер надбавак. Таксама з гэтага часу вырастуць працоўныя пенсіі. Расказваем, хто можа разлічваць на прыбаўку зарплат і пенсій.

ВЫРАСТУЦЬ ЗАРПЛАТЫ Ў БЮДЖЭТНІКАЎ

З верасня да 235 рублёў павысіцца памер базавай стаўкі. Цяпер яна складае 228 рублёў.

— Базавая стаўка — галоўны элемент у заработнай плаце ў бюджэтнай галіне. Павышаецца базавая стаўка — растуць кампенсацыйныя і стымулюючыя выплаты. Мы ацэньваем, што па выніках года з улікам росту базавай стаўкі і стымулюючых выплат заработная плата ў бюджэтнай сферы вырасце дзесьці на 15 %, — расказала ў інтэрв'ю тэлеканалу «Беларусь 1» **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ**.

Нагадаем, што базавая стаўка сёлета павышаецца ўжо другі раз. Першы раз яна падрасла з 1 студзеня на 7,5 % і склала 228 рублёў. З 1 верасня тэмп росту складзе 3 %. Пры гэтым сёлета быў прыняты Указ № 3 «Аб мерах па забеспячэнні своечасовай выплаты заработнай платы».

— Цяпер работніку не трэба хадзіць па калідорах судовых органаў. Калі наймальнік не можа забяспечыць выкананне сваіх абавязацельстваў, уступае ў работу патрабаванне з боку дэпартамента Дзяржаўнай інспекцыі працы. Калі наймальнік іх не выконвае, уключаюцца органы прымусовага выканання, — растлумачыла механізм дзеяння Ірына Касцевіч.

Такім чынам, з красавіка бягучага года па 3,5 тысячах чалавек, якім не была выплачана заработная плата, наймальнікі атрымалі дзвесце патрабаванняў аналь на сем мільёнаў рублёў.

— За кароткі перыяд аналь кожны трэці работнік атрымаў заработную плату. Вядома, гэта не ўсе, і нам хацелася б максімальна хутка ісці па дадзеным працэсе, але мы напрацоўваем практыку і ёсць станоўчыя вынікі. А самае галоўнае, што мы ўбачылі: калі людзі сутыкаюцца з такімі праблемамі, яны прыходзяць да нас, і мы дапамагаем іх вырашаць, — падзялілася міністр.

У НАСТАЎНІКАЎ ПАВЫСЯЦЦА НАДБАЎКІ

Міністэрства адукацыі ўнесла змяненні ў пастанову № 71 «Аб аплаце працы работнікаў адукацыі ад 3 чэрвеня 2019 года».

Змяненні прадугледжваюць перагляд надбавак з 1 верасня. На 15 % (з 6 % да 21 %) павялічана надбаўка для настаўнікаў за работу ў галіне. Таксама ўстаноўлена надбаўка кураторам вучэбных груп ВНУ на дзённай форме атрымання адукацыі (за выключэннем выпускнога курса) у памеры 100 % базавай стаўкі, выпускнога курса — 50 % базавай стаўкі.

Пры гэтым напярэдадні Дня ведаў адрасную дапамогу ад дзяржавы атрымалі тыя катэгорыі грамадзян, якія маюць у ёй патрэбу. Пераважна гэта шматдзетныя сем'і, дзе трое і больш дзяцей. 30 % бюджэту пражыткавага мінімуму, а гэта 109 рублёў, атрымалі такія сем'і на кожнага школьніка. На выплаты выдаткавана больш чым 23 мільёны рублёў. У выніку дапамогу атрымаў кожны пяты школьнік. Але падтрымку аказала не толькі дзяржава.

— Мы звярнуліся да нашых сацыяльных партнёраў — гэта прадпрыемствы, прафсаюзы, грамадскія арганізацыі, такія, як Беларускі саюз жанчын, «Белая Русь», БРСМ, і яны запусцілі свае праекты «Сабраць партфель у школу». Гэта сапраўдная кансалідацыя грамадства, якая прызваная дапамагчы тым людзям, што маюць патрэбу, і самае галоўнае — стварыць свята дзецям, — падкрэсліла Ірына Касцевіч.

ПАВЯЛІЧАЦЦА ПЕНСІІ

З 1 верасня вырастуць працоўныя пенсіі. Адпаведны ўказ быў падпісаны Прэзідэнтам краіны і прадугледжвае іх павышэнне ў сярэднім на 5 %. Паводле папярэдняй ацэнкі, сярэдні памер пенсіі па ўзросце непрацуючага пенсіянера ў верасні складзе 737 рублёў. У параўнанні з вераснем мінулага года гэта 15-працэнтны рост.

— Сёння ў краіне 2,3 мільёна чалавек атрымлівае працоўную пенсію. Такое павышэнне на 5 % для дзяржавы складзе 72 мільёны рублёў, якія будуць дадаткова накіраваны на выплату пенсій. А ўвогуле вераснёўскія расходы на выплаты пенсій — 1,7 мільярда рублёў. Гэта важкія расходы, якія нясе дзяржава, каб забяспечыць свае абавязацельствы перад пенсіянерамі. На выплаты пенсій ідзе 9 % ВУП. А гэта сумарныя расходы на адукацыю і ахову здароўя ў нашай дзяржаве, — адзначыла Ірына Касцевіч.

Ірына Касцевіч заўважыла, што ў Беларусі працуе 418 тысяч пенсіянераў.

— У асноўным гэта нашы маладыя пенсіянеры, якія нядаўна пачалі атрымліваць пенсію. Ёсць унікальная норма — адкладзеная пенсія, калі пенсіянер працягвае працаваць, дзякуй богу, што здароўе дазваляе і ён цікавы наймальніку, бо валодае вялікім досведам і ведамі, пры гэтым ён можа не атрымліваць пенсію падчас работы, а, напрыклад, праз пяць гадоў, калі пакіне работу, пенсія можа быць такім чынам значна павялічана, — нагадала міністр.

ЭКСПЕРЫМЕНТ ПА АПЛАЦЕ ТРАНСПАРТУ

Ён стартуе ў Мінску таксама з 1 верасня. У яго рамках плануецца арганізаваць улік усіх катэгорый перавезеных пасажыраў, у тым ліку льготнай (прадстаўнікі якой ездзяць бясплатна), і пралічыць усе расходы, звязаныя з работай транспарту.

З 1 верасня навучэнцам двух сталічных каледжаў і чатырох школ будуць выдадзены бескантактныя смарт-карткі, аналагічныя праязному білету. Далей, з 1 кастрычніка, у рамках эксперыменту карткі будуць выдадзеныя льготнай катэгорыі грамадзян — інвалідам, ветэранам ВАВ. А з 1 студзеня 2024 года ў планах забяспечыць выдачай картак усіх грамадзян ільготных катэгорый.

— Гэта будзе зручна і самім пасажырам, у нас жа будзе магчымасць удасканальваць парадак кампенсацыі расходаў з бюджэту за выкананую транспартную работу, — адзначылі ў камітэце эканомікі Мінгарвыканкама.

Алена КРАВЕЦ.

Жніво-2023

ПАШАНА — ВІРТУОЗАМ ПАЛЁЎ

Тры раёны Брэстчыны ў мінулыя выхадныя адсвяткавалі «Дажынкі»

Яшчэ на мінулым тыдні ўсе гаспадаркі Брэсцкай вобласці завяршылі ўборку збожжавых каласавых і зернебабовых культур. Земляробы адразу ўзяліся актыўна рыхтаваць глебу для сяўбы азімага рапсу. І ў большасці сельгаспрадпрыемстваў ужо справіліся з сяўбой гэтай культуры. У раёнах падводзяць вынікі ўборачнай кампаніі і спраўляюць фестывалі працаўнікоў вёскі. Так, у мінулую суботу «Дажынкі» адсвяткавалі ў Ляхавіцкім, Жабінкаўскім, Іванаўскім раёнах.

Старшыня Іванаўскага райвыканкама Анатоль ТКАЧУК з перадавікамі жніва.

На Ляхавіччыне месцам правядзення свята выбралі вёску Галаўнінцы, якая сустрэла віноўнікаў урачыстасці ды гасцей прыбранай і папрыгажэлай. Паводле слоў **намесніка старшыні райвыканкама — начальніка райсельгасхарча Васіля ПЫЖЫКА,** хлебаробы раёна прыйшлі да свята з дастойнымі вынікамі. Найвышэйшыя паказчыкі тэмпаў росту і валавога збору збожжа забяспечылі ААТ «Шлях новы», ААТ «Нача», СУП «Ліпнянка». Іх і ўшаноўвалі ў самым пачатку ўрачыстай часткі фестывалю.

Асаблівая ўдзячнасць у гэты дзень была выказана камбайнерам — перадавікам жніва. Віншаванні прымалі Андрэй Дзянішчык і Генадзь Хмарук, іх экіпаж намалаціў больш за 1900 тон збожжа. У лідарах таксама — экіпажы камбайнераў Віктара Клямені і Сяргея Зянько, Юрыя Буцько і Мікалая Занько. Кожны з экіпажаў паказаў найлепшыя вынікі з улікам каэфіцыента, устаноўленага ў залежнасці ад мадэлі і ўзросту камбайна.

Найлепшымі кіроўцамі на адвозцы збожжа прызнаныя ў раёне Уладзімір Пабягайла, Мікалай Бярэзіч і Сяргей Вейкніс. Узнагародзілі ў гэты дзень таксама маладзёжныя экіпажы камбайнераў, маладых кіроўцаў, аператараў зернесушыльных комплексаў — усе атрымалі заслужаную пашану. Адзначылі нават ААТ «Ляхавіцкі льнозавод» за найлепшую кампазіцыю з саломы.

Даволі насычаная праграма фестывалю ўключыла ў сябе парад караваяў, стракатую выставу падворкаў рамеснікаў і сельскіх майстроў-умельцаў, канцэрт удзельнікаў мастацкай самадзейнасці.

Жабінкаўскія «Дажынкі» ў аграгарадку Сцяпанкі пачаліся з парада сельскагаспадарчай тэхнікі, які сабраў шмат гледачоў. Яшчэ **Старшыня Жабінкаўскага райвыканкама Андрэй КУЗЬМІЧ** перад уручэннем узнагарод нагадаў асноўныя вынікі ўборачнай кампаніі. Паводле яго слоў, бягучы год стаў годам дасягненняў для многіх сельгасарганізацый. Напрыклад, земляробы ААТ «Жабінкаўскае» сёлета сабралі 9000 тон збожжа, што на 1500 больш за леташні паказчык. Унітарнае прадпрыемства «Арэпічы» сабрала 7000 тон, тым самым павялічыла свой леташні каравай на 2000 тон. Хлебаробы ААТ «Вазнясенскі» дасягнулі самай высокай ураджайнасці ў раёне — атрымалі 60 цэнтнераў з кожнага гектара.

Шэсце калектываў Жабінкаўскага раёна.

Падворак Ляхавіцкага раёна.

больш іх было на конкурсе прафесійнага майстэрства «Віртуозы палёў». Сапраўднымі майстрамі-прафесіяналамі праявілі сябе ўдзельнікі конкурсу. А яшчэ прадэманстравалі, што ўмеюць не толькі паказваць клас на палях, але і займаюцца спортам, культурна адпачываюць. Некаторыя ўдзельнікі з названага конкурсу накіраваліся проста на валейбольную пляцоўку, дзе праявілі спартыўную моц, высокую вынослівасць і, вядома, камандны дух.

Іванаўскія аграрыі святкавалі поспехі ў вёсцы Гарбаха. Па традыцыі фестываль пачаўся з шэсця працоўных калектываў, перадавікоў жніва, творчых калектываў раёна. Павіншаваць герояў дня прыбылі прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, ветэраны, моладзь. Узнагароды атрымалі пераможцы спаборніцтва. Святочны канцэрт-віншаванне прадставілі найлепшыя творчыя калектывы раёна.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з тэлеграм-каналаў раёнаў.

КАНАЛЫ ПРАЧЫШЧАНЫ, ПАШПАРТЫ АТРЫМАНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Спецыяліст удкладніў, што ўсе сістэмы ацяплення сталічных дамоў апрэсаваны (праверены на герметычнасць) і прайшлі гідрапнеўмапрамыўкі (для гэтага звадкаванае паветра падаецца ў трубаправоды сістэмы ацяплення, запоўненыя вадой, што стварае высокую турбулентнасць руху, уздымае адкладанні са сцен труб і такім чынам выдаляе іх знутры сетак і прылад. — **Аўт.**).

На тэхабслугоўвані 67 арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі сталіцы 6421 шматкватэрны жылы дом. Гэта ведамаснае жыллё, сумесныя домаўладанні, жыллёвыя і будаўніча-спажывецкія кааператывы, таварыствы ўласнікаў. Сталічныя камунальнікі абслугоўваюць таксама 520 дамоў, дзе карыстаюцца газавымі награвальнікамі. У такім жыллі прачышчана 8537 дымавых каналаў і 16 839 вентыляцыйных каналаў.

— Згодна з планам, да 1 кастрычніка неабходна адрамантаваць 383,532 м² дахаў (зроблена 371,864 м²). Бягучы рамонт дахаў выкананы на 100 %, а капітальны — на 94 %. Рамонт стыкаў зроблены ў памеры 228,712 метра пагонных (100 % плана). Цалкам (на 100 %) выкананы рамонт воданагравальнікаў і помпаў, — паведаміў прадстаўнік Мінскай ЖКГ. — Капрамонт сёлета запланаваны ў 168 шматкватэрных дамах (уведзена каля 60 будынкаў), астатнія ў рабоце. Да канца года капрамонт выканаюць па ўсім абазначаным жылфондзе.

У Мінску ў доме па вул. Каліноўскага, 26 капрамонт з цеплавой мадэрнізацыяй выкананы згодна з Указам № 327 аб правядзенні энергаэфектыўных мерапрыемстваў, які дазваляе рабіць ацяпленне ў доме напалову за кошт жыхароў з растэрміноўкай на дзесяць гадоў, а напалову за кошт дзяржавы. Работы па ўцяпленні тут ужо зроблены (цяпер завяршаюць рамонт балконаў), і жыроўкі жыхароў, якія пачалі выплачваць грошы за праведзеныя мерапрыемствы, павялічыліся не больш чым на 20 рублёў. Затое зімой яны адразу адчуюць, наколькі меншыя будуць налічэнні за ацяпленне, упэўнены спецыяліст. Праўда, больш на такія ўмовы так ніхто з мінчан і не пагадзіўся.

Андрэй Новік удкладніў, што на 100 % выкананы сёлетні план па цеплавой рэабілітацыі дамоў (17,509 м²), рамонту балконаў (1587 адзінак), шкленні (9989 м²). Заменена 78 сістэм аўтаматычнага рэгулявання, якія дазваляюць пераходзіць у рэжым прапальвання пры змене тэмператур паветра на вуліцы (план — 129,51 сістэма ў стане замены). Па плане неабходна было замяніць 23 групавыя прыборы ўліку ў шматкватэрных дамах (заменена 10) і 31 цеплаабменнік (заменена 23).

ДЛЯ САЦЫЯЛЬНЫХ СТАНДАРТАЎ І НА ВЫПАДАК АВАРЫІ

Праведзеныя мерапрыемствы дазволілі атрымаць пашпарты гатоўнасці спажыўцоў цеплавой энергіі ўсяму жылфонду, які знаходзіцца на абслугоўванні арганізацый ЖКГ, дадаў Андрэй Новік.

Атрымала пашпарт гатоўнасці і прадпрыемства «Мінсккамунцепласетка», спецыялісты якога правялі прафілактычны рамонт 46 сваіх кацельных і 315 цэнтральных цеплапунктаў, выпрабавалі абсталяванне цеплясетак (каля 950 кіламетраў), правялі работы па дыягностыцы кацельнага і дапаможнага абсталявання, па выніках якіх зрабілі рамонты, падзяліўся **Генадзь ЛУКАШЭВІЧ, першы намеснік дырэктара — галоўны інжынер прадпрыемства «Мінсккамунцепласетка»**:

— Цяпер абсталяванне кацельных, цеплясетак і цэнтральных цеплапунктаў працуе ў эканамічным рэжыме, вытрымліваючы сацыяльныя стандарты. На прадпрыемстве створаны аварыйны запас неабходнага матэрыялу (паліўнага мазуту і драўнянага паліва) на выпадак аварыйных сітуацый. Цалкам укамплектаваны дыспетчарская і аварыйна-рамонтная службы, што дазволіць аператыўна рэагаваць на пазаштатныя сітуацыі.

Калі пашпарт гатоўнасці своечасова не атрыманы, то асноўная праблема, якая ўзнікае праз гэта, — у жыллё не падаецца цяпло, і людзі ў ацяпляльны сезон могуць застацца без абагрэву, адзначыў Андрэй Новік:

— Аднак у сталіцы такога, як правіла, не дапускаюць. Любымі рычагамі ўздзейнічаюць, каб быў выкананы ўвесь комплекс мерапрыемстваў і пашпарты былі атрыманы своечасова ва ўсім жыллі: якое абслугоўваецца і арганізацыямі ЖКГ, і ведамствамі, і самастойна.

ЗАРОБАК ДВОРНІКА І СРОДКІ ВІДЭАСУВЯЗІ

Для выканання работ у асенне-зімовы перыяд неабходны кадры. Сёння гэта дзве асноўныя рабочыя спецыяльнасці. Па штаце патрэбна 2264 рабочыя па комплекснай уборцы і ўтрыманні домаўладанняў (дворнікаў). Вакансій у сталіцы на гэтую пасаду толькі 59. Амаль такая ж сітуацыя з рабочымі па комплексным абслугоўванні будынкаў і збудаванняў.

— Многія адзінкі не закрытыя чыста фармальна, бо людзі цяпер праходзяць медагляды і збіраюць дакументы для працаўладкавання, так што ўкамплектаванасць рабочымі кадрамі 97,3 %, што сведчыць аб тым, што ў сталічных арганізацыях ЖКГ створана здаровая рабочая абстаноўка. Работа па падборы кадраў робіцца штодня. Магчыма, ёсць пытанні да якаснага складу гэтай катэгорыі рабочых, бо гэта не надта высакародная работа. Аднак той, хто працуе старанна, атрымлівае прыстойны заробак (тысяча рублёў і нават больш) у залежнасці ад аб'ёму работ. Рабочыя забяспечваюцца поўным пакетам сацыяльных гарантый, атрымліваюць прэміі і ўзнагароды. Сёлета падалі нашых работнікаў на конкурс «Мінчанін года», чакаем вынікаў. Усё гэта стымулюе на працу.

Каб адсочваць, як вядзецца работа спецыялістамі службаў ЖКГ (і не толькі), усё большае распаўсюджванне атрымліваюць сродкі мабільнай відэасувязі. Практычна класікай стала выкарыстанне GPS-навігатараў у грузавых і легкавых машынах. Праводзіліся ў сталіцы і пробныя мерапрыемствы па кантролі работы дворнікаў.

— Цяпер якраз падводзяць іх вынікі, аднак пакуль няма нават мінімальнага ахопу забеспячэння гэтымі датчыкамі рабочых, — заўважыў Андрэй Новік. — Хаця яны выкарыстоўваюцца ўва многіх арганізацыях. Супрацоўнікі «Мінгаза», напрыклад, ходзяць з датчыкамі, дыктафонамі, відэарэгістратарамі. Думаю, што ў найбліжэйшай будучыні такія прылады, як відэарэгістратар, з'явяцца і ў большасці супрацоўнікаў нашых арганізацый, якія непасрэдна працуюць з людзьмі і выходзяць на абследаванні кватэр. Гэта дазволіць у далейшым пазбегнуць спрэчных сітуацый.

Ірына СІДАРОК.

ЖЫЦЦЁ ДЗЯЦЕЙ — У РУКАХ ДАРОСЛЫХ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

У аддзелах канцылярскіх прылад — вогнетушыцелі і аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі. Уся атрыбутыка суправаджаецца інфармацыйным ярлыком з адпаведным слоганам «Для дзяцей, пакінутых без нагляду». У якасці экспертаў наведвальнікі гандлёвых цэнтраў сустракаюць ратавальнікаў, з вуснаў якіх можна пачуць аб правілах бяспечных паводзін. Такім чынам, супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях дапамагаюць набыць не толькі школьныя прылады, але і бясцэнны багаж ведаў.

Другі этап інфармацыйна-прапагандысцкай кампаніі працягнецца з 1 да 15 верасня. Пляцоўкамі правядзення мерапрыемстваў стануць адукацыйныя ўстановы, а таксама месцы масавага знаходжання людзей. У школах дзеці паўдзельнічаюць у тэматычных «уроках бяспекі» і атрымаюць наглядна-выяўленчую прадукцыю, паглядзяць навучальныя фільмы, настаўнікі пройдуць інструктажы па пажарнай бяспецы, а бацькі сустрэнуцца для правядзення прафілактычных гутарак і прагляду тэматычных відэафільмаў ад ратавальнікаў. У месцах масавага знаходжання людзей адбудуцца святы з інтэрактыўнымі зонамі актыўнасці. Кожны ўдзельнік запомніць пяць важных крокаў на шляху да ратавання, навучыцца карыстацца вогнетушыцелем, даведаецца алгарытмы аказання першай дапамогі, праверыць свае веды ў тэматычных тэсціраваннях, здасць экзамен па бяспецы.

Зацікавіць і прыцягнуць бацькоў да навучання дзяцей правілам бяспекі, паўплываць на бестурботнае стаўленне дарослых да пытання дзіцячай бяспекі, матываваць іх не пакідаць малых без нагляду — галоўная мэта інфармацыйнай кампаніі.

КАР'ЕРЫ І БУДОЎЛІ — НЕ МЕСЦЫ ДЛЯ ГУЛЬНІ!

Калі вы не зможаце паўдзельнічаць у гэтых мерапрыемствах, вам будуць карысныя парады, якімі ратавальнікі падзяліліся з карэспандэнтамі «Звязды». Абавязкова прагаварыце ўсе сітуацыі са сваімі дзецьмі — і, паверце, вы іх узброіце ведамі, якія часам найбольш важныя, чым тыя, што ў школьным заплечніку.

Варта патлумачыць дзецям, што будоўля — гэта не дзіцячая пляцоўка, дзе можна гуляць. Важна данесці, каб яны пазбягалі такіх небяспечных месцаў, як вышкі, закінутыя будынкі, гарышчы, яры, кар'еры. Далёка па прыклады, на жаль, хадзіць не трэба. Гульні на кар'еры ў Быхаве скончыліся смерцю дзіцяці 2013 года нараджэння. Трагедыя здарылася ў ліпені. Як высветлілася, трое дзяцей гулялі на кар'еры, які на момант здарэння не эксплуатаваўся. Аднаго з хлопчыкаў засыпала пяском. Двое яго сяброў пабеглі клікаць на дапамогу бацькоў, але было ўжо позна. Ратавальнікі, якія аператыўна прыбылі на месца здарэння, а таксама мясцовыя жыхары дасталі з-пад завалу хлопчыка без прыкмет жыцця.

Днямі чатырохгадовае дзіця загінула ў Лідзе. На выхадных хлопчык разам са сваёй сям'ёй гасцяваў у бабулі. Трагедыя здарылася на вуліцы, куды ён пайшоў гуляць разам з суседскімі дзецьмі. Месца для гульні выбралі небяспечнае — каля цеплавых труб, якія знаходзіліся на ўзвышанасці і не былі замацаваныя. На адну трубу забраліся старэйшыя дзеці і пачалі качацца. У пэўны момант яна пакацілася і зацяснула чатырохгадовае дзіця. Па дарозе ў бальніцу хлопчык памёр.

ХАДЗІЦЕ Ў НАВУШНІКАХ ДОМА!

Не дазваляйце дзецям самастойна пераскакаць дарогу, пакуль не навучыце іх рабіць гэта правільна. З пачатку года на дарогах краіны загінула сямёра дзяцей, больш як 80 юных удзельнікаў дарожнага руху атрымалі траўмы ў якасці пешаходаў. Патлумачце дзецям, што асцярожнымі варта быць і ў дварах. Ні адзін мяч або цацка не вартыя таго, каб кідацца за імі пад машыну. Аб правілах паводзін на дарогах, у тым ліку падчас кіравання веласіпедам або сродкам персанальнай мабільнасці, мы падрабязна пісалі ў нумары за 25 жніўня.

Важны момант, на які варта звярнуць увагу непаўналетнім удзельнікам дарожнага руху, — праслухоўванне музыкі праз навушнікі і гаджэты. Пры перасячэнні праезнай часткі варта выняць з вушэй навушнікі, прыбраць тэлефон у сумку або кішэню. Адмовіцца ад праслухоўвання музыкі з дапамогай навушнікаў варта і падчас перасячэння чыгуначных пуцей, прагулак каля чыгункі. Многія трагедыі здараюцца менавіта з-за такога захаплення непаўналетніх, якое адцягвае іх увагу ад галоўнага. Крыху больш за два тыдні таму пад коламі цягніка загінула школьніца. Па папярэдніх даных, 12-гадовая дзяўчынка вярталася ад сяброўкі дамоў — ішла яна ўздоўж чыгуначных пуцей. Па версіі следства, пацярпелая знаходзілася ў навушніках.

Катэгарычна забараняецца перабягаць чыгуначныя пуці перад цягніком, які ідзе, — перамяшчацца ўздоўж чыгункі неабходна на адлегласці не бліжэй як пяць метраў ад крайняй рэйкі. Таксама важна папярэдзіць дзяцей: ніякіх гульняў на чыгунцы, а таксама сэлфі на фоне цягніка, які набліжаецца.

З АГНЁМ НЕ ЖАРТУЮЦЬ

Зрабіце свой дом не толькі прыгожым і ўтульным, але яшчэ і бяспечным. Абмяжуйце доступ дзяцей, асабліва малых, да электрапрыбораў. Жудаснае здарэнне днямі здарылася ў Салігорску. Жанчына купала сваё паўтарагадовае дзіця ў ванне. Усяго на некалькі хвілін маці выйшла ў іншы пакой, як здарылася непапраўнае: хлопчык пацягнуўся па цацкі і выпадкова скінуў у ваду фен, які быў падключаны да разеткі. Выратаваць дзіця не ўдалося.

— Паважаныя бацькі, паклапаціцеся аб пажарнай бяспецы ва ўласным доме, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ**. — Устанавіць пажарныя апавяшчальнікі не патрабуе ад вас вялікіх намаганняў і сур'ёзных грашовых затрат. Затое гэты невялічкі прыбор можа выратаваць самае дарагое, што ў вас ёсць, — дзяцей. Патлумачце сваім падапечным тое, чым для іх могуць скончыцца гульні з запалкамі, эксперыменты з агнём.

У прыватнасці, дзіцячае свавольства з агнём у пачатку лета прывяло да ўзгарання саломы ў Смалявіцкім раёне. Прычынай пажару стала гульня дзяўчынак-падлеткаў з запальнічкай. Побач з саломай яны падпалілі пакет, ад якога і распаўсюдзіўся агонь. Самастойна патушыць узгаранне ў іх не атрымалася.

Варта кантраляваць знаходжанне дзяцей падалей ад вогнішча, не дапускаць самастойнага выкарыстання імі адкрытага агню. Увогуле, пры развядзенні вогнішчаў патрэбна быць надзвычай асцярожнымі. Пачасціліся выпадкі, калі дзеці атрымліваюць траўмы пры выкарыстанні дарослымі лёгкаўзгаральных і гаручых вадкасцяў. У ліпені ў Аршанскую гарадскую бальніцу з апёкамі 40 % цела паступіў хлопчык 2014 года нараджэння. Высветлілася, што разам з маці дзеці былі на дачы. Прыгатаваць ежу вырашылі на кастры. У той час, як маці пераключыла сваю ўвагу на іншае, яе сын вынес з хаты ёмістасць з бензінам. Сястра хлопчыка ўзяла з мангала палку і апусціла яе ў бензін — адбылася ўспышка. На хлопчыку загарэлася адзенне. На шчасце, на дапамогу падаспела маці, але без медыкаў не абышлося.

Каб пазбегнуць падобных непрыемнасцяў, ратавальнікі нагадваюць: ні ў якім разе для распальвання вогнішча нельга выкарыстоўваць лёгкаўзгаральныя і гаручыя вадкасці. Увогуле, захоўвайце іх у недаступным для дзяцей месцы.

ЗАЧЫНІЦЕ ВОКНЫ!

Да якога часу дзеці будуць падаць з вокнаў? Бацькі, вашы дзеці не птушкі! Лятаць яны не ўмеюць. Таму паклапаціцеся аб тым, каб вокны не ўяўлялі небяспеку для маленькіх членаў сям'і. Калі адчыняеце, то рабіце гэта ў рэжыме праветрывання. Спадзявацца на маскітную сетку не варта: яна абсалютна не ўтрымлівае вагі нават самага маленькага дзіцяці, не кажучы ўжо пра старшакласнікаў. Каб увогуле быць спакойнымі на гэты конт, устанавіце на вокны замкі — у любы момант вы можаце зачыніць іх на ключ.

На жаль, нягледзячы на ўсе сучасныя дэвайсы, разлічаныя на бяспечнае існаванне, дзеці працягваюць выпадаць з акон. Не так даўно трагедыя здарылася ў Старых Дарогах. Бацькі займаліся хатнімі клопатамі і не заўважылі, як адчыненае насцеж акно прывабіла іх сына. Хлопчык забраўся на канапу, якая стаяла каля акна, — і паляцеў уніз. Маленькага жыхара дома, які ўжо знаходзіўся без прытомнасці, на вуліцы заўважыў прахожы, які выклікаў хуткую дапамогу. З цяжкімі траўмамі пацярпелы быў шпіталізаваны, але выратаваць яго не ўдалося.

Днямі раней аналагічны выпадак адбыўся ў Віцебску, дзе з акна выпаў пяцігадовы хлопчык. Прачнуўшыся раніцай, ён зразумеў, што знаходзіцца дома адзін. У пошуку бацькоў дзіця абаперлася на маскітную сетку і выпала з другога паверха. На шчасце, усё скончылася толькі бальніцай. А вось у Магілёве хэпі-энду не адбылося: з шостага паверха выпала паўтарагадовая дзяўчынка. Бабуля, якая глядзела ўнучку, усяго толькі выйшла на кухню, каб разагрэць ежу.

— Многія бацькі лічаць, што дзіця можна пакінуць аднаго дома, але нават некалькіх хвілін дастаткова для таго, каб здарылася непапраўнае, — заўважае Анастасія Швайбовіч. — І не варта спадзявацца на мабільны тэлефон, дзякуючы якому вы можаце звязацца са сваім дзіцем у любую хвіліну. Гэта памылковае меркаванне. Бацькі забываюць самае важнае, што ў момант узнікнення пагрозы званок не зможа зберагчы і выратаваць дзіця ад небяспекі. Аб гэтым сведчыць і кампанія МНС «Будзь побач з дзіцем», якая нядаўна стартавала. Яе слоган — тэлефон не дагледзіць ваша дзіця — з'яўляецца вельмі актуальным.

Калі ваша дзіця дастаткова дарослае, каб самастойна знаходзіцца дома, вы павінны ведаць, чым яно займаецца; калі гуляе, то з кім. У такім выпадку бацькі павінны быць на сувязі са сваімі нашчадкамі. Не лішнім будзе прайграць сітуацыю, калі дзіця адно дома і незнаёмыя людзі патэлефанавалі ў дзверы. Алгарытм паводзін просты: ні ў якім разе не адчыняць дзверы і не падаваць выгляду, што ты адзін дома. І яшчэ вельмі важная дэталь — ваша дзіця павінна ведаць свой адрас, тэлефон, а таксама тэлефон ратавальнікаў і алгарытм іх выкліку: патэлефанаваць, сказаць, што адбылося, дзе вы знаходзіцеся, назваць сваё імя і прозвішча, нумар тэлефона.

Навучыць непаўналетніх правілам паводзін у хаце, школе і на вуліцы нескладана. Усяго адна такая размова можа зберагчы іх ад розных небяспек, якіх у нашым свеце нямала. Не варта разлічваць выключна на ратавальнікаў і настаўнікаў. Толькі бацькі здольныя арганізаваць бяспечнае існаванне свайго дзіцяці.

Вераніка КАНЮТА.
Фота з адкрытых крыніц.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Наўседа заклікаў не ладзіць кампанію па закрыцці КПП на граніцы з Беларуссю

Аб гэтым прэзідэнт Літвы заявіў, наведваючы пагранічную зону, паведамляе ТАСС.

Гітанас Наўседа лічыць няправільным ператвараць закрыццё кантрольна-прапускных пунктаў «у своеасаблівы спорт». На яго думку, рашэнне аб закрыцці павінна быць узважаным, кожны выпадак трэба ацэньваць індывідуальна. «Трэба ацэньваць нязручнасці для жыхароў, магчымыя страты», — указаў літоўскі лідар. Напярэдадні кіраўнік МУС Літвы Агнэ Білатайце заявіла аб планах закрыць яшчэ два КПП на граніцы з Беларуссю. У сваю чаргу прэм'ер Літвы Інгрыда Шыманітэ паведаміла, што ва ўрада краіны няма такіх планаў.

18 жніўня Літва закрыла два з шасці КПП на граніцы з Беларуссю — «Шумскас» (сумежны «Лоша») і «Твярачус» (сумежны «Відзы»).

Індыя спадзяецца, што на саміце G20 атрымаецца ўзгадніць сумесную заяву

Індыя як краіна-старшыня «Вялікай дваццаткі» разлічвае, што саміт, які адбудзецца 9–10 верасня ў Нью-Дэлі, завершыцца прыняццем сумеснай заявы. Аб гэтым заявіў міністр замежных спраў рэспублікі Субраманіям Джайшанкар, паведамляе ТАСС. Індыя з 1 снежня 2022 года ўзначальвае Групу дваццаці і рэгулярна праводзіць сустрэчы на ўзроўні міністраў па розных кірунках сумеснай працы G20. Як правіла, яны завяршаюцца без прыняцця сумеснай заявы, яе замяняе так званы выніковы дакумент і рэзюмэ старшыні, у якім пункты, што не атрымалі падтрымкі ўсіх дэлегацый, маюць статус «рэзюмэ старшыні». Галоўнай перашкодай на гэтых сустрэчах з'яўляецца тэма сітуацыі ва Украіне — расійская дэлегацыя выступае супраць уключэння адпаведнага пункта ў сумесную заяву, а прадстаўнікі КНР адзначаюць, што пляцоўка G20 не падыходзіць для абмеркавання геапалітычных пытанняў.

На саміт у Нью-Дэлі запрошаны ўсе лідары «дваццаткі», а таксама кіраўнікі яшчэ дзевяці краін: Бангладэш, Егіпта, Іспаніі, Маўрыкія, Нігерыі, Нідэрландаў, ААЭ, Амана і Сінгапура. РФ на саміце прадставіць міністр замежных спраў Сяргей Лаўроў.

У Польшчы ад хваробы легіянераў памерлі 14 чалавек

Успышка легіянелёзу, таксама вядомага як «хвароба легіянераў», зафіксавана ў польскім Жэшуве Падкарпацкага ваяводства на поўдні краіны. «У выніку заражэння легіянелай у Падкарпацці памерлі 14 чалавек. Да гэтага часу заражэнне бактэрыямі было пацверджана ў 153 жыхароў рэгіёна», — цытуе дзяржаўную санітарную інспекцыю Жэшувы РІА «Новости». У панядзелак мясцовыя органы аховы здароўя паведамлялі пра 11 памерлых ад названай інфекцыі. Пры гэтым было заўважана, што іх узрост вар'іруецца ад 64 да 95 гадоў, усе яны пакутавалі ад іншых хранічных захворванняў. Па звестках санінспекцыі, крыніца заражэння знаходзілася ў водаправодзе.

У суботу ў Жэшуве праводзілі дэзынфекцыю водаправоду, дадаючы ў ваду павялічаную колькасць хлору. Справу аб успышцы «хваробы легіянераў» расследуе Агенцтва ўнутранай бяспекі Польшчы. Легіянелёз — гэта вострае інфекцыйнае захворванне. Хвароба суправаджаецца моўнай ліхаманкай, інтаксікацыяй, а таксама паражэннем лёгкіх, цэнтральнай нервовай сістэмы і органаў стрававання. Бактэрыя можа актыўна размнажацца ў сістэмах водазабеспячэння і кандыцыянавання паветра.

Перажытае — незабытае

ДЗЯЦІНСТВА І ЗДАРОЎЕ Ў НАС ЗАБРАЛА ВАЙНА

— Эх, набрацца б сіл, прайсці па ўсыпанай кветкамі лугавіне, пасядзець на імшыстым пні, паслухаць зязюлю... Якое б гэта свята было! — кажа Паліна Сямёнаўна і ўспамінае, як некалі з татам на лодцы (яна — упершыню!) плылі па Дняпры, як на іншым беразе ў лесе збіралі грыбы ды ягады, як потым, вярнуўшыся дамоў, усе разам — мама, сястрычка Аня, брацік Валодзя — елі духмяныя суніцы, радаваліся, што іх шмат, хвалілі, што яна, малая, назбірала столькі баравікоў-падасінавікаў...
Паміж тымі даваеннымі днямі і сённяшнімі — інваліда першай групы — чаго толькі не было!

Выпрабаванні пачаліся ў дзень, калі іх Дуброўна запаланілі чужынцы ў чорных жалезных касках, якія нешта гергеталі, пагражалі аўтаматамі, забіралі ўсё, што хацелася, забівалі свіней, гарлапанілі песні.

Па вуліцах, міма спаленых і дагараючых хат, адзін за адным рухаліся танкі, машыны, матацыклы. З дняпроўскіх глыбінь вытыркаліся рэшткі разгромленага моста... А немцы ўсё ішлі і ішлі, ехалі ды ехалі.

Родныя Паліны Выдранковай, калі іх жытло таксама ператварылася ў попел, туліліся ў зямлянцы. Калі разбурыліся і яе, — многіх дзяцей прытуліў сусед дзед Бадай, у якога быў вялікі склеп.

— Але ж сапраўдны жах, — кажа Паліна Сямёнаўна, — людзі зведалі пазней, калі ўбачылі натоўп яўрэяў, якіх немцы сагналі ў адзін будынак. Сярод няшчасных былі мае аднакласнікі, іх бацькі, і мы, дзеці, нягледзячы на ахову, насілі ім хлеб ды іншую ежу, аж пакуль не пачулі, што ўсіх — і дарослых, і дзяцей — расстралялі за будынкам фабрыкі...

У 1943-м, калі да горада сталі набліжацца нашы, немцы аб'явілі, што заставацца тут вельмі небяспечна, бо чакаюцца жорсткія баі, што фюрар дае ўсім магчымасць перабрацца ў Бярдзічаў, дзе можна будзе спакойна жыць і працаваць...

Пасля таго вялікую калону гараджан, вяскоўцаў і падвод з паклажай фашысты пагналі ў Оршу, дзе людзей загрузілі ў так званыя цялятнікі і павезлі.

Праз нейкі час і ў нейкім нямецкім горадзе пачалося размеркаванне.

— Мы трапілі ў Вупперталь, на завод з асаблівым рэжымам пражывання і прымусовай працы, — успамінае Паліна Сямёнаўна. — Уся тэрыторыя знаходзілася за калючым дротам і пад пільнай аховай вартавых з аўчаркамі. Барак, дзе жылі нявольнікі з Беларусі і Украіны, быў вельмі вялікі і халодны (сонца туды не пранікала ніколі). З мэблі ў пакойчыках — двух'ярусныя ложкі. Мы, дзеці, цэлымі днямі сядзелі там: ні кніжак, ні цацак, ні гульняў... Дзверы адчыняліся толькі раніцай і вечарам, калі нас выпускалі ўзяць сабе місачку баланды з бручкі і кавалачак хлеба.

— Не памятаю, які паёк быў у дарослых, але я заўсёды хацела есці і ўсяго баялася, — працягвае Паліна Сямёнаўна. — Тое ж самае адчувалі Аня і Валодзя. Усе надзеі былі на нашу бабулю Пелагею. Яна працавала на кухні і зрэдку прыносіла хлебныя скарыначкі... Мама прыбірала ў цэхах, тата вывозіў з іх металічную стружку. Аднойчы, ужо ў пачатку 1945-га, яго моцна прыціснула ваганеткай. Ён не мог больш працаваць — заставаўся ў пакоі і без аніякай медыцынскай дапамогі... Паміраў у страшных пакутах!

Вязняў гналі на завод вельмі рана, а вярталіся яны позна ўвечары і настолькі знясіленыя, што адразу ж падалі на ложкі. Аднак сон іх часта быў ірваны, бо з калідора даносіліся стогны і крыкі тых, каго вартавыя збівалі, цягнулі на допыты...

— А вас, дзяцей, немцы таксама білі за нейкія правіны? — пытаюся ў Паліны Сямёнаўны.

— Не, такога не здаралася — прыдумляць не буду, бо мы сядзелі як тыя мышы пад венікам: лішні крок баяліся зрабіць... Крыві ў нас таксама, дзякуй богу, не бралі, але дзяцінства не было. Быў пастаянны страх і адчай маленькіх рабоў.

Помню, як нас вызвалялі, як англічане і амерыканцы частавалі пячэннем і шакаладам, агітавалі на пераезд у Штаты, Канаду, Аўстралію... Былі і нашы, савецкія афіцэры. Многія сем'і паехалі на радзіму.

...У Дуброўне ў Выдранковых ніякага жытла не было. Яны дабраліся да Гомеля, знайшлі прытулак у сям'і мамінага брата. Дзеці пайшлі ў школу і як маглі адбіваліся ад хвароб.

На дапамогу з боку ўлад прыезджыя не разлічвалі, бо пасля вайны вязняў нямецкіх працоўных лагераў лічылі ледзь не прыслужнікамі фашыстаў. Таму ўсё прыйшлося здабываць самім: маці ўладкавалася на работу, з дапамогай брата паставілі хаціну.

...Паліна скончыла чыгуначны тэхнікум і да выхаду на пенсію працавала бухгалтарам, разам з мужам нарадзілі і выгадавалі дваіх дзяцей.

Дачкі Наталлі ўжо няма сярод жывых, пра маці клапоціцца сын Ігар. Паліна Сямёнаўна Шапавалава (у дзявоцтве Выдранкова) змагла даказаць, што з верасня 1943-га да красавіка 1945-га была непаўналетнім вязнем фашысцкага лагера, адным са шматлікіх дзяцей вайны.

Уладзімір Пернікаў,
г. Гомель.

Асабістае

«Мінулае ізноў паўстане блізкім...»

Ёсць у мяне добры стары знаёмец Анатоль Вялічка. Настаўнік, сем'янін, гаспадар, краязнавец — гэта пра яго, чалавека, які ніколі не шукаў і да сёння не шукае спакою.

У нашым ліставанні нярэдка з'яўляюцца здымкі і навіны, якімі Анатоль не без гонару дзеліцца са мной. А я, у сваю чаргу, вельмі многае з дасланага ўяўляю на старонках газеты, на тэлеэкране, бо гэта — каштоўныя штрыхі да партрэта сучасніка, які, не зважаючы на сталы ўзрост, шмат часу прысвячае рабоце з дзецьмі. Яго ўрокі мужнасці, экскурсіі па школьным гістарычным музеі, паездкі з дзятвой на вострай Зыслаў, дзе ў час вайны ў лясных зямлянках партызаны выпускалі газету «Звязда», — гэта прыклад, варты пераймання.

А таму — фота з паштовай скрынкі. На здымку — сам Анатоль Вялічка каля адноўленай зямлянкі.

Не парушаючы жанру перапіскі, шаноўнаму Анатолю і ўсім ветэранам мой верш і вітанне.

х х х

Як зорак не злічыць над галавой
І кветак у бяскрайнім летнім полі,
Усяго, што ёсць у памяці тваёй,
Не падлічыць нікому і ніколі.

Але няўмольна, удзень або ўначы,
Закрэсліўшы радкі штодзённых думак,
Запатрабуе сэрца: падлічы
Ды абвясці мінуламу рахунак.

І ты ўбачыш мужных продкаў строй —
Мінулае ізноў паўстане блізкім:
Код гістарычнай памяці тваёй
Праступіць на граніце абеліскаў.

Яўген Пясецкі.

След на зямлі

«КАЛІ НЕ Я, ТО ХТО?» — СЛОВЫ, ШТО СТАЛІ ДЭВІЗАМ

Часта здараецца, што нейкі на першы погляд зусім нязначны выпадак надоўга застаецца ў памяці, дыктуе паводзіны, нават больш за тое — вызначае лёс.
«Аднойчы ў наш клас зайшла настаўніца, — успамінае прараб ААТ «Будаўнік» Станіслаў Гарлуковіч, — убачыла на падлозе разбіты вазон і стала шукаць вінаватага. Ён, вядома ж, быў сярод нас, але не прызнаваўся. І клас яго не здаваў... Тады настаўніца сказала, што перасаджваць кветку давядзецца... мне. «Чаму гэта?» — стаў абурацца я. — «А хто, калі не ты?»
Гэтыя словы настаўніцы вучань запомніў на ўсё жыццё, яны сталі яго дэвізам.

...Дзяцінства Станіслава Казіміравіча прайшло ў вёсцы Зубаўшчына ў шматдзетнай сям'і, дзе апроч яго ўжо раслі брат і чатыры сястры. З самых малых гадоў хлопчык стараўся дапамагаць ім, а калі ўвабраўся ў сілу, сам навучыўся касіць, упраўляцца з канём, араць, баранаваць... І ў вучобе, як кажа яго былая настаўніца Галіна Драбышэўская, Станіслаў заўсёды вылучаўся стараннасцю, жаданнем дапамагаць адстаючым.

Пасля сямігодкі юнак паступіў у Ашмянскае СПТВ, атрымаў прафесію трактарыста-машыніста, але папрацаваць на землях роднай Ашмяншчыны яму не давялося: прызвалі ў войска, накіравалі ў так званы будбат, дзе праз некалькі месяцаў малады салдат ужо стаў разбірацца ў розных відах кладкі, выдатна спраўляцца з забутоўкай, выкладваць вуглы, цярпліва вучыць іншых...

Мусіць, таму яму настойліва раілі заставацца ў войску, абяцалі добры заробак і жыллё паблізу да месца службы — у Ленінградзе. Хлопец не пагадзіўся: вярнуўся на радзіму, уладкаваўся ў ПМК-25 мулярам пятага разраду.

...Для забеспячэння сям'і, у якой хутка нарадзілася першая дачушка, патрабаваліся грошы. Станіслава як выдатнага муляра запрашалі на падпрацоўкі, на так званыя халтуры. Яму ж хацелася прадоўжыць вучобу, і калі аб'явілі набор на завочную форму ў Мінскі палітэхнікум, ён без ваганняў завёз дакументы — паступіў, адвучыўся, стаў дыпламаваным спецыялістам, як казаў іх дырэктар, — першай скрыпкай на будоўлі.

У гэтай вось якасці Станіслаў Казіміравіч вёў работы на будаўніцтве дзясяткаў аб'ектаў... А зрэшты, мінулы час тут зусім недарэчы, бо ветэран, нягледзячы на свае 70 з добрым гакам, па-ранейшаму ў страі. Чаму? Ды таму, што з дзяцінства помніць: «Калі не я, то хто?».

Мікалай Балыш,
г. Ашмяны.

Чалавек — чалавеку

РАБІ, ШТО ТРЭБА І ХАЙ БУДЗЕ, ШТО БУДЗЕ

У вёсцы любая навіна разносіцца хутка, а ўжо гэта... «Чулі, Верка, меншая дачка Іваноўскіх, сышлася з дачнікам». — «З якім? Што летась аўдавеў?» — наўмысна перапытвалі адны. «Жывым — жывое», — заўважалі іншыя, нібы нагадваючы, што нікога не трэба асуджаць.

Саракагадовая Вера, вядома ж, здагадвалася пра вясковыя размовы, але, што называецца, не брала іх да галавы, бо тут — як ты ні зрабі — цябе ўсё роўна абгавораць.

Некалі казалі, што ёй, малодшай Іваноўскай, лёгка ўсё дастаецца: і сталічная кватэра, і добрая работа, і дачка...

А насамрэч лёгкім было не жыццё, а характар жанчыны, якая не скардзілася на свае праблемы, а імкнулася іх адольваць. Вось ці кожны згадзіўся б даглядаць адзінокую пажылую жанчыну ўзамен на абяцанне адпісаць кватэру? Вядома ж, не! Вера згадзілася і дзесяць гадоў выконвала чужыя капрызы, церпячы няпросты нораў сваёй падапечнай, нават калі тая даводзіла яе да слёз.

Нарадзіць без мужа дзіця, зноў жа, адважыцца не кожная. «Ад каго?», «Навошта?», «Здурнела», — шумела вёска, а Вера, калі стукнула трыццаць, вырашыла, што пара. І на свет з'явілася Міланка — сонейка для ўсёй радні. Бо гадаваць малую дапамагалі і вясковыя бацькі, і старэйшая сястра з малодшым братам, што таксама аселі ў Мінску.

Пайсці працаваць прыбіральшчыцай, маючы дыплом аб вышэйшай адукацыі? «Ні ў якім разе!» — усклікнуў бы хтосьці. А маладая маці пайшла, бо вярнуцца пасля дэкрэтнага водпуску туды, дзе была аформленая раней, ёй ніяк не выпадала. Затое на новым месцы начальства неяк адразу заўважыла Верына ўменне ладзіць з людзьмі, і хутка энергічная супрацоўніца стала спецыялістам па рабоце з персаналам, а праз нейкі час дарасла да кіраўніка сярэдняга звяна.

Што да Мікалая, чыё лецішча знаходзіцца побач з падворкам яе бацькоў, то ён, пахаваўшы жонку, стаў «залечваць» свой боль алкаголем. Угаворы дарослай дачкі, сяброў ды іншай радні аказаліся марнымі: чалавек страціў работу і, магчыма, далей каціўся б у бездань, калі б не Вера, якая знайшла патрэбныя словы, адвадзіла суседа ад гарэлкі, дапамагла ўладкавацца на новае месца — туды, дзе працавала сама.

Такім чынам яны разам сталі праводзіць не толькі вясковыя выхадныя, але і гарадскія будні. Мікалаю як паветра спатрэбіліся Верыны пяшчота і клопат. Ну а яна, хоць і прывыкла з усім спраўляцца сама, адчула, як добра, калі побач надзейнае мужчынскае плячо! А таму неўзабаве гэтыя двое зразумелі, што яго сівізна і яе маршчынкі — зусім не перашкода для таго, каб адкрыць свае сэрцы новаму пачуццю...

Вера і Мікалай (а з імі, вядома, Міланка) цяпер жывуць разам і, не зважаючы на вясковыя плёткі, радуюцца ўласнаму шчасцю, бо ведаюць: жыццё і так кароткае, каб траціць яго на думкі пра тое, што людзі скажуць.

Ірына Матусевіч,
Дзяржынскі раён.

«СВЕТ СПАЗНАЕЦЦА НЕ ТОЛЬКІ НАВУКОВЫМІ МЕТАДАМІ, АЛЕ І ПРАЗ МАСТАЦКІ ВОБРАЗ...»

Вялікая гутарка з Аляксандрам РАДЗЬКОВЫМ

(Працяг.
Пачатак у нумары 29 жніўня)

— Лічыцца, што чытанне развівае інтэлект... А ці здараецца ў сучасным свеце часам адваротнае — ад прачытання пэўнага кшталту літаратуры чалавек «адурняецца»?

— Першым аспірантам у мяне быў Сяргей Гуцановіч — вельмі таленавіты вучоны і арыгінальны чалавек. Прыходзіў да мяне заўсёды з цэлым спісам пытанняў і не сыходзіў, пакуль на кожнае з іх не атрымліваў дасканалы адказ. Мае калегі ў гэтых выпадках казалі, што Гуцановіч залез да Радзькова пад кашулю і, пакуль усё, што яго цікавіць, не высветліць, адтуль не вылезе. Сяргей працаваў азартна, з максімальным паглыбленнем у вывучэнне навуковых праблем, сябе не шкадаваў. Я яго стрымліваў, апекаваў, шкадаваў.

Прыязджае ў канцы жніўня да мяне і прыносіць рукапісы двух падрыхтаваных ім да друку навуковых артыкулаў. Пытаюся:

— Сярожа, дзе ты правёў адпачынак?

— У Крыме.

— Чым там займаўся?

— Вывучаў сучасныя публікацыі па тэме даследавання, напісаў два артыкулы.

— Хачу цябе на будучыню папярэдзіць, што навуковая праца складаецца не толькі з паглыблення ў даследчую працу, але і з гарачага паўднёвага сонца, цёплага мора, сакавітай садавіны, не кажучы ўжо пра лёгкія курортныя зносіны паміж маладымі людзьмі!

Спадзяюся, што і гэтая мая парада паспрыяла Сяргею абараніць кандыдацкую, а неўзабаве і доктарскую дысертацыю.

Інтэлектуальны патэнцыял у чалавека прыроджаны. Пры гэтым важна вызначыць, якой ён прадметнай накіраванасці, у якім напрамку трэба дзіцяў з малых гадоў развіваць. Узровень агульнага інтэлекту таксама адразу заўважны. У народзе ж заўсёды вылучалі і паважалі разумнага чалавека: ці ён пастух у вёсцы, ці брыгадзір на вытворчасці. А ўжо афіцыйна прызнаных мудрацоў — жрацоў, філосафаў, пісьменнікаў, навукоўцаў — паважалі безумоўна. Стаўленне да думаючага чалавека гранічна зразумела гучыць у народнай творчасці, напрыклад, у прыказках: «Няма розуму — лічы калека», «Лепш з разумным страціць, чым з дурнем знайсці», «Дзе розум, там і карысць».

Інтэлект развівае не толькі чытанне кніг, але ўжо сапраўды яно яму не шкодзіць. Мне сустракаліся людзі, якія кнігі паглыналі ў вялікай колькасці, але не маглі іх нават толкам пераказаць. І былі знаёмыя, якія ўвогуле нічога не чыталі, але суразмоўцы былі найцікавейшыя. Пустыя па змесце кнігі таксама трапляюцца, але тут трэба быць карэктным у ацэнках. Можа, ты іх не зразумеў, не дарос да іх успрымання, яны напісаны не для цябе. Ад кніг наўрад ці падурнееш...

— У мастацтве існуе «эфект рамачкі» — любы прадмет, вылучаны з прасторы так, каб на ім была сканцэнтраваная ўвага публікі, набывае нечаканую значнасць і неадназначнасць, сімвалічнасць... Вы пішаце ў жанры нон-фікшн. Ці сустракаліся вы з такім эфектам у сваёй творчасці — раптам падсвечваецца, набывае нечаканую трактоўку нейкая апісаная вамі дэталь, факт, нечы учынак, нечая асоба?

— Так, сустракаўся! Напрыклад, доўга выношваў кнігу аб матэматыцы. Мяне заўсёды захапляла гэтая навука, я з задавальненнем выкладаў яе раздзелы ва ўніверсітэце, удзельнічаў у арганізацыі матэматычнай адукацыі ў Беларусі. Яшчэ на пасадзе міністра адукацыі задумаў апавяданне аб шэдэўрах матэматычнай думкі. Мне вельмі хацелася прыгажосцю і арыгінальнасцю ідэй, вынікамі даследаванняў вядомых вучоных прывабіць да гэтай навукі як мага больш таленавітых юнакоў

і дзяўчат. Праект прыцягнуў шматлікіх беларускіх матэматыкаў, якія падзялілася са мной сваімі захапленнямі ад узлёту матэматычнай думкі. На гэтую карпатлівую працу спатрэбілася дваццаць гадоў, у выніку яна сфакусіравалася ў выдадзеную «Мастацкай літаратурай» кнігу «Пра матэматыку і матэматыкаў». І калі гэтая праца выйшла ў свет, я нечакана стаў атрымліваць водгукі аб патрыятычнай накіраванасці гэтай кнігі. Навукоўцы, настаўнікі, проста людзі, якія чытаюць, раптам усвядомілі, што ў нашай краіне працавалі і працуюць матэматыкі сусветнага маштабу, ім падуладныя рашэнні задач, над якімі стагоддзямі біліся вялікія навукоўцы, у нас функцыянуюць вядомыя ва ўсім свеце навуковыя школы. Бо ў развіцці сусветнай матэматычнай культуры могуць удзельнічаць толькі высокаразвітыя краіны, а з гэтай кнігі выразна відаць — Беларусь сярод іх. Людзі мне казалі, што яшчэ больш пачалі ганарыцца нашай краінай!

— Мы з вамі ўжо гаварылі пра фізікаў-фантастаў... А вось матэматыкамі былі майстры літаратуры абсурду Хармс, Хлебнікаў і Льюіс Кэрал. Велімір Хлебнікаў нават спрабаваў вывесці «ўраўненне шчасця», з'ядноўваючы матэматыку, паэзію, гісторыю і містыку. Няўжо менавіта матэматыка дапамагае выйсці за межы логікі? Ці ведаеце вы прыклады матэматыкаў-фантазёраў у сучасным свеце?

— Калі чалавек прафесійна дакрануўся да матэматыкі, то яна яго ўжо ніколі не адпусціць. Тлумачыцца гэта, на мой погляд, тым, што яна патрабуе глыбокага пагружэння ў свае тэорыі і таямніцы, велізарнай напругі разумовых сіл, вялікіх часавых выдаткаў на засваенне шчыльна ўпакаванай інфармацыі. Канчаткова ўспліць з дасягнутых глыбінь ужо ніяк не атрымліваецца. Таму ў любой мастацкай творчасці вучонага-матэматыка будзе так ці інакш прысутнічаць праява яго прафесійных якасцяў — абстрактнасць мыслення, абгрунтаванасць дзеянняў, доказнасць высноў, строгая логіка падзей. Матэматык, што б ён ні пісаў, кожнае слова будзе нагружаць гранічна — ён выхаваны патрабаваннем максімальнай згорнутасці выкладзенай інфармацыі. І калі чытач з першага погляду не разумее мастацкую творчасць матэматыка, гэта не азначае, што яна абсудная. Ну як можна меркаваць, што дзве паралельныя прамыя недзе перасякуцца? А дапусціўшы такое, мы атрымліваем не толькі несупярэчлівую, але і карысную ў жыцці геаметрыю. А як можна ўявіць перамнажэнне прамавугольных лікавых табліц? А гэта тэорыя матрыц, без якой цяжка растлумачыць фантастычныя для ўспрымання, але рэальныя законы квантавай фізікі. Не спяшайцеся адпрэчваць мудрагелістыя прыгоды Алісы ў Краіне Цудаў — там у кожнай фразе матэматык Льюіс Кэрал закладваў глыбокі, праўда, часта вельмі незвычайны, сэнс. А хочаце — пачытайце казкі нашага вядомага беларускага матэматыка Алега Ісідаравіча Мельнікава. Упэўнены, атрымаеце задавальненне ад прачытанага і самі ўбачыце доказ маіх сцвярджэнняў аб спецыфіцы мастацкай творчасці вучоных гэтай навуковай галіны.

— Хачу згадаць у нашай размове найцікавейшую асобу Язэпа Драздовіча... Ён не толькі мастак, якога параўноўваюць з Чурлёнісам, але і аўтар навуковага трактата «Нябесныя бегі». З аднаго боку, ён сцвярджаў, што ў сваіх «візіях» падарожнічае па розных планетах, апісвае сустрэчы з іншапланецянамі, пейзажы Сатурна і Марса, што мяжуе з містыкай. З другога боку, намагаўся быць навукоўцам. Як з пункту гледжання сучаснай навукі можна ацаніць напісанае Драздовічам? Ці ёсць там нейкія прадбачанні навуковых адкрыццяў, як некаторыя сцвярджаюць?

— У Язэпа Драздовіча «Нябесныя бегі» ў большай ступені мастацкі твор, а не навуковы трактат. Нават на час напісання гэтай кнігі шмат што ў навуцы ўжо тлумачылася зусім інакш. У Драздовіча ўсе планеты Сонечнай сістэмы заселеныя, размяшчаюцца і перамяшчаюцца па прыдуманых ім (дарэчы, вельмі арыгінальных) законах, па-свойму ён тлумачыць і паходжанне нашай зорнай сістэмы. Але шмат у чым наіўнае ўспрыманне найбліжэйшай да нас касмічнай прасторы суправаджаецца выдатнымі аўтарскімі літаграфіямі, таму кніга займальная, своеасаблівая. Навуковыя адкрыцці аўтар наўрад ці прадбачыў, але сваю непадробную цікавасць да даследавання космасу шматлікім чытачам сапраўды перадаў. Мне таксама бачыцца, што Язэп сваімі «Нябеснымі бегамі» інтуітыўна адчувае адну загадку, над якой да гэтага часу б'ецца чалавечы розум: для чаго чалавеку прыродай дадзены мозг з такімі магчымасцямі? Бо для завяршэння харчовага ланцужка такіх яго здольнасцяў не трэба. А з дапамогай мозгу чалавек выйшаў за межы Зямлі. Толькі чалавек! Для чаго? Ці прадугледжана нам падарожнічаць да іншых зорных сістэм? Яны ж неймаверна далёкія! Ці знойдзем мы іншапланетны розум? А ён нам патрэбен, ён не небяспечны? І прыкметныя крокі ў гэтым кірунку чалавецтва ўжо зрабіла. Што нас чакае ў будучыні? Як творчая натура, арыгінальна думаючы чалавек, Драздовіч шукаў адказы на гэтыя пытанні, таму яго разважанні і сёння цікавыя.

— Ці можна вывесці ўніверсальныя правілы для выхоўвання таленавітага пісьменніка? Якія якасці маладога чалавека могуць падказаць, што з яго выйдзе добры творца, — ці гэта падказаць немагчыма? Ці здаралася вам падштурхнуць кагось стаць на творчы шлях?

— Мне ўяўляецца, што творчыя задаткі прыроджаныя, а іх развіццё да прыкметнага праяўлення фарміруецца навакольным асяроддзем чалавека. Мне з дзяцінства часта даводзілася назіраць, што ў некаторых хлапчукоў, сяброў, якія атачалі мяне, былі здольнасці цікава распавесці пра школьнае жыццё, пра летнія прыгоды, пра асаблівасці паводзін дарослых. Іх цікава было слухаць. У студэнцкія гады такія таленты сталі яшчэ больш заўважнымі. У адным пакоі інтэрната з намі жыў Ваня Швед. Гэты назіральны, кемлівы хлопец гэтак цікава, з палескім каларытам мог расказаць нам пра пачутае і ўбачанае, што мы нават не сумняваліся: гэта будучы пісьменнік. Напрыклад, менавіта ад Вані я пачуў расповед, як здаваў экзамен па электратэхніцы наш аднакурснік Вася Кавалёў. Вася меў відавочныя артыстычныя здольнасці. Калі ён са сцэны чытаў урыўкі з «Паднятай цаліны» пра дзеда Шчукара — зала плакала ад смеху. Але матэматыка, фізіка яму даваліся нялёгка. Без «неудов» не абыходзілася ні адна сесія. Ад адлічэння Васю ратавалі ўсё тыя ж артыстычныя таленты, яго маналогі з задавальненнем слухалі і ўсе педагогі. Але калі ён у самага строгага на нашым фізмаце выкладчыка Аляксандра Яўстаф'евіча Несцерава на іспыце па найскладанейшым курсе электратэхнікі атрымаў выдатную адзнаку, нашаму здзіўленню не было мяжы. Але далей вонкавага здзіўлення гэтым фактам мы не пайшлі, а Ваня з гэтага зрабіў бліскучую замалёўку. Ён пайшоў да Аляксандра Яўстаф'евіча спытаць, як жа Вася здолеў так адказаць на іспыце. І перадаў нам тлумачэнне выкладчыка:

— Я дваццаць гадоў выкладаю электратэхніку і толькі цяпер убачыў, як з дапамогай рук і ног можна растлумачыць працу трохфазнага электрарухавіка!

Такія апавяданні Вані Шведа мы маглі слухаць гадзінамі. Пасля інстытута ён працаваў дырэктарам школы і працягваў назапашваць падобныя апавяданні ўжо пра жыццё землякоў. Апублікаваць іх не паспеў — трагічна загінуў у аўтамабільнай катастрофе. Мне бачыцца, што пісьменніцкае майстэрства развіваецца і шліфуецца навакольным асяроддзем, перш за ўсё ў сям'і. Можна ўжо па тым, як і што кажа малеча, зразумець узровень культуры зносін яго бацькоў і іншых сваякоў. Потым школа, універсітэт. Упэўнены, не было б такога творчага атачэння ў Пушкіна ў сям'і, а потым у ліцэі, і мы не захапляліся б яго геніяльным складам.

І цяпер, на мой погляд, галоўнае — у гэтым пытанні. Пра што пісаць? Добра, калі ты адораны ўменнем фантазіраваць. Але нават для жанру фантастыкі трэба мець добрую адукацыйную базу і грунтоўны жыццёвы досвед. Нездарма ж Максім Горкі перад тым, як пісаць, «пайшоў у людзі». А Артур Хэйлі свае бестселеры «Колы», «Аэрапорт», «Гатэль» пісаў пасля таго, як на працяглы час уладкоўваўся працаваць у адпаведныя вытворчасці. З практыкі сваёй палітычнай працы ведаю, што, для таго каб людзі да цябе прыслухаліся, прынялі твае погляды на жыццё, пачулі твае заклікі, мала правільна выбудаваць сваю прамову. Трэба, каб у табе ўбачылі дасведчанага чалавека, які ўжо нечага дасягнуў у жыцці. Думаю, падобным чынам успрымаюць і пісьменніка з яго кнігай. Таму набывайце прафесію, удасканальвайцеся ў ёй, рухайцеся па службовай лесвіцы і не перастаравайце цікавіцца жыццём ва ўсіх яго праявах. Прыкмячайце яркае, незвычайнае, пераказвайце ўбачанае сваім сябрам. Асабліва ўражальнае можаце запісаць. І нікому не кажыце, што пішаце кнігу. У лепшым выпадку ў навакольных гэта будзе выклікаць раздражненне. Паверце, прыйдзе час, і ўсё вамі назапашанае папросіць выйсця. Вы скажаце — а як жа блогеры? Юныя, без ведаў і досведу, а збіраюць мільёны падпісчыкаў. Трэба прызнаць, што многія з іх крэатыўныя, умела арыентуюцца на адпаведную аўдыторыю, валодаюць сучаснымі формамі падачы інфармацыі. Але ж усё ў іх павярхоўна, лёгка прыйшло і гэтак жа лёгка сышло, таму ненадоўга. А людзі заўсёды будуць шукаць грунтоўных адказаў на жыццёва важныя для іх пытанні. І каб прапанаваць ім варыянты такіх адказаў, трэба шмат і ўпарта над гэтым працаваць.

Падрыхтавала
Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

(Заканчэнне будзе.)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
30 жніўня 2023 г. № 31 (717)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

АДУКАЦЫЯ ЯК ПАДМУРАК ДЗЯРЖАВЫ

Фота БелТА.

Наталля КАЧАНАВА ўзяла ўдзел у гарадскім педагагічным форуме «Адукацыя сталіцы: новыя рэаліі і новыя магчымасці»

Ужо стала традыцыйным напярэдадні новага навучальнага года абмяркоўваць актуальныя пытанні, што стаяць перад адукацыйнай сферай, вызначаць напрамкі, па якіх варта рухацца далей. Жнівень — перыяд вялікай настройкі, калі ўсе элементы сістэмы адукацыі (ад інфраструктуры да вучэбна-матэрыяльнай базы, кадравага забеспячэння навучальнай установы) падвяргаюцца рэвізіі, крытычнаму аналізу і карэкціроўцы. Апагеем гэтай маштабнай работы стаў форум, падчас якога педагагічная вертыкаль Мінска (а менавіта на сталічную сістэму адукацыі раўняецца ўся краіна) з удзелам вышэйшых службовых асоб абмянялася думкамі наконт арганізацыі навучальнага і выхаваўчага працэсаў, спынілася на праблемных момантах сферы адукацыі, вызначылася з перспектыўнымі рашэннямі, якія паспяхова ўкараняюцца некаторымі навучальнымі ўстановамі.

Адзінае выхаваўчае асяроддзе

Сваім бачаннем далейшага развіцця сістэмы адукацыі сталіцы падзяліўся **старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Андрэй СТРЫГЕЛЬСКІ**. «Наш прыярытэт — гэта апераджальнае развіццё, — падкрэсліў ён. — Адукацыі горада проста жыццёва неабходна значна павялічыць хуткасць на трэку свайго развіцця. І справа не ў тым, што мы сур'ёзна адстаём у параўнанні з іншымі рэгіёнамі (якраз наадварот: па большасці параметраў мы лідзіруем), а таму што, як сказаў наш Прэзідэнт, каштоўнаснае значэнне адукацыі сёння значна ўзрастае. Адукацыя, яе якасць і даступнасць становяцца ледзь ці не асноўным фактарам паспяховасці чалавека ў жыцці, падмуркам нашай дзяржавы, яго эканомікі і сацыяльнага развіцця».

Наколькі сталічная сістэма адукацыі падрыхтавана да рэалізацыі гэтай місіі, ці ў поўнай меры раскрыты яе патэнцыял, як выконваюцца даручэнні кіраўніка дзяржавы, урада, кіраўніцтва горада — адказы на гэтыя пытанні былі знойдзены падчас гарадскога педагагічнага форуму.

Асаблівую ўвагу настаўніцкая і выхавацельская супольнасць Мінска павінна засяродзіць на грамадзянска-патрыятычным выхаванні. Адна з задач — умацаванне адзінага выхаваўчага асяроддзя, арыентаванага на патрыятызм, нацыянальную ідэнтычнасць, духоўна-маральную культуру і традыцыйныя каштоўнасці. «Мы добра разумеем, да якіх негатыўных наступстваў могуць прывесці чужыя нам сістэмы каштоўнасцяў, што спрабуюць навязаць звонку, — адзначыў Андрэй Стрыгельскі. — Роля і ўплыў педагога ў тым, каб не дапусціць расколу грамадства, умацаваць яго адзінства. Гістарычная роля сістэмы адукацыі сёння заключаецца ў выхаванні патрыятызму, адказнасці за сваю краіну».

На выхаванне дзяцей працуе ўсё ўнікальнае сацыякультурнае асяроддзе сталіцы. «Патрыётамі не нараджаюцца, патрыётаў выхоўваюць, — звярнуў увагу старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама. — Але нашай галоўнай мэтай паранейшаму застаецца павышэнне якасці і рэзультатыўнасці выхавання. Найважнейшы прынцып — максімальнае паглыбленне кожнага дзіцяці: ад выхаванца дзіцячага садка да навучэнца каледжа. Сродак дасягнення — прадуманая стратэгія выхавання ў кожным навучальным калектыве».

З гэтай мэтай прапаноўваецца выпрацаваць новыя падыходы, але не варта грэбаваць і тымі эфектыўнымі метадамі работы з дзецьмі, якія існуюць цяпер. Выхаваўчыя магчымасці кожнага ўрока, выхаваўчы патэнцыял пазакласных мерапрыемстваў і выхаваўчае ўздзеянне настаўніка — усё гэта ў сукупнасці прынясе станоўчы вынік у фарміраванні асобы юнага грамадзяніна.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

«Мы хочам паказаць патэнцыял нашай краіны»

У Беларусі пройдзе першы беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум

З 4 да 7 верасня па запрашэнні Савета Рэспублікі нашу краіну з афіцыйным візітам наведае парламенцкая дэлегацыя Рэспублікі Узбекістан на чале са Старшынёй Сената Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан Танзілой Нарбаевай. У графіку візіту — абмеркаванне пытанняў міжпарламенцкага ўзаемадзеяння. Акрамя таго, упершыню будзе праведзены беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум, арганізатарам якога выступае Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

«Мы хочам паказаць патэнцыял нашай краіны, паказаць нашу краіну ў цэлым, нашу гасціннасць. Вядома, для нас вельмі важны эканамічны складнік, таму што нас звязваюць добрыя адносіны, шматлікія кантракты, пагадненні, якія дзейнічаюць паміж краінамі. І гэта надасць новы імпульс у супрацоўніцтве. Самае галоўнае — правядзенне дадзенага мерапрыемства павінна даць новы штуршок да супрацоўніцтва паміж нашымі жаночымі, маладзёжнымі арганізацыямі. Мы спадзяёмся, што тыя добрыя, дружалюбныя адносіны, якія ёсць паміж нашымі краінамі і народамі, дзякуючы такім мерапрыемствам будуць прырастаць», — адзначала Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава падчас размовы з журналістамі.

5 верасня падчас секцыйных пасяджэнняў будуць разгледжаны найважнейшыя пытанні супрацоўніцтва дзвюх краін. Удзельніцы форуму абмяркуюць пашырэнне супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана ў галіне прамысловасці. У рамках праграмы ўдзельніцы форуму наведаюць з экскурсіяй вытворчыя цэхі БелАЗа, карпаратыўны музей знакамітага прадпрыемства.

Для ўдзельніц секцыі, прысвечанай супрацоўніцтву ў лёгкай прамысловасці, арганізатары падрыхтавалі экскурсію на вытворчыя цэхі ААТ «Камволь».

Не застанецца без увагі ўмацаванне партнёрства аграпрамысловых комплексаў Беларусі і Узбекістана. Пасяджэнне такой секцыі адбудзецца на базе ААТ «Азярыцкі-Агра» (Смалявіцкі раён, Мінская вобласць). Удзельнікі азнаёмяцца з арганізацыяй работы малочнатаварнай фермы, агароднінабульбасховішча, наведаюць выставу прадукцыі ААТ «Азярыцкі-Агра». Падчас работы секцыі асобная ўвага будзе аддадзена ролі жаночай працы ў развіцці сельскай гаспадаркі і сельскіх тэрыторый абедзвюх краін, выпрацоўцы прапаноў у Дэкларацыю першага беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму.

Сярод тэм для разгляду — супрацоўніцтва краін у сферах медыцыны і фармацэўтыкі. Пасяджэнне адпаведнай секцыі пройдзе на базе Гарадскога цэнтра трансфузіялогіі УАЗ «Гарадская клінічная бальніца № 6».

Таксама ў рамках адпаведнай секцыі на абмеркаванне вынесены такія тэмы, як рэалізацыя партнёрства ў сферы навукі і адукацыі і патэнцыял узаемных кантактаў у сферы культуры і турызму. Пасяджэнне дадзенай секцыі адбудзецца ў знакавым для беларускай культуры месцы — Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета. Плануюцца выступленні, прысвечаныя рэалізацыі сумесных культурных праектаў, развіццю турызму паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Узбекістан; перспектывам развіцця супрацоўніцтва ў сферы музейнай дзейнасці; экспарту адукацыйных паслуг.

Ключавое мерапрыемства першага беларуска-ўзбекскага жаночага бізнес-форуму — пленарнае пасяджэнне на тэму «Жанчыны ў бізнесе — патэнцыял для развіцця дзелавога супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана» — запланавана на 6 верасня.

Валерыя СЦЯЦКО.

АДУКАЦЫЯ ЯК ПАДМУРАК ДЗЯРЖАВЫ

«Убачыць кожнае дзіця»

Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта па горадзе Мінску Наталля КАЧАНАВА выказала ўпэўненасць, што з прыходам новага старшыні камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама апераджальнае развіццё адукацыі сталіцы будзе рэалізавана ў поўным аб'ёме. «Ёсць усе магчымасці для таго, каб сапраўды гэтая адукацыя была перадавой, — падкрэсліла яна. — Такой мы яе і лічым. І тыя навацыі, якія вы можаце адпрацаваць з улікам таго патэнцыялу, які ёсць (прафесійны, наяўнасць навучальных устаноў у Мінску), можна было б распаўсюджваць і на іншыя навучальныя ўстановы нашай краіны — для нас гэта вельмі важна».

Спікер верхняй палаты парламента нагадала, што Прэзідэнт сістэме адукацыі заўсёды ўдзяляе павышаную ўвагу. «Кіраўнік дзяржавы сказаў адназначна, што сёлета мы павінны канчаткова дашліфаваць усё, што датычыцца сістэмы адукацыі, і паставіць кропку, — акцэнтавала ўвагу Наталля Качанава. — Прэзідэнт паставіў перад намі задачу глядзець уважліва і кантраляваць уступную кампанію, каб не было ніякіх эксцэсаў, бо пашырылі катэгорыі юнакоў і дзяўчат, якія паступаюць у вышэйшыя навучальныя ўстановы па спрошчанай сістэме: гэта алімпіяднікі, ліцэісты. Павялічылі мэтавы набор. Усе тыя прэферэнцыі, якія ёсць, апраўданыя. Таленавітых юнакоў і дзяўчат, якія могуць вучыцца ў вышэйшых навучальных установах, вы ў школах бачыце».

Старшыня Савета Рэспублікі парэкамендавала прадстаўнікам сферы адукацыі глыбей глядзець на праблемы, якія сёння існуюць. Адна з іх — дэмаграфічная, што характэрна для многіх краін. Чым больш становіцца цывілізаваным свет, тым радзей людзі задумваюцца аб дзецях. Такая палітыка непрымальная для нашай дзяржавы, бо за дзецьмі, як падкрэсліла Наталля Качанава, — будучыня нашай краіны. Невыпадкова статусу сям'і, падтрымцы сем'яў удзяляецца вялікая ўвага. У гэтым плане, па меркаванні спікера верхняй палаты парламента, вялікае значэнне мае пазіцыя навучальных устаноў: выхавацелям, настаўнікам і выкладчыкам варта ўдзяліць асаблівую ўвагу выхаванню дзяцей у рэчышчы традыцыйных каштоўнасцяў. «Ёсць тое, што можа перадаць чалавеку толькі чалавек, — удакладніла Наталля Качанава. — Вы, школы і дзіцячыя дашкольныя ўстановы, больш бачыце і ведаеце, што адбываецца ў кожнай сям'і з канкрэтным дзіцём».

Развіццё інклюзіўнай адукацыі, што таксама абмяркоўвалася падчас форуму, знаходзіцца на пастаянным кантролі ў Савеце Рэспублікі. Пад старшынствам Наталлі Качанавай створаны савет, які займаецца аказаннем дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей з рэдкімі генетычнымі захворваннямі. «Дзяцей з аўтыстычнымі расстройствамі за апошнія пяць гадоў стала ў два разы больш, — канстатавала спікер. — Гэта вельмі сур'ёзная тэма. У нашай краіне выбудавана сістэма, якая дазваляе аказваць дапамогу і падтрымку гэтым сем'ям. Першае пытанне, з якім прыходзяць бацькі, — гэта кваліфікацыя цьютараў і педагогаў. І вельмі важна, што ў нашай вядучай педагагічнай ВНУ — БДПУ імя Максіма Танка — ёсць Інстытут інклюзіўнай адукацыі, ёсць цудоўныя напрацоўкі. Самі педагогі казалі: нам не трэба гэтых спецшкол, і мы ад іх адышлі. Але раз у нас інклюзія, мы павінны працаваць з імі так, каб гэта было эфектыўна, каб гэтыя дзеці потым маглі жыць і працаваць у соцыуме, атрымліваць адукацыю. Мы да гэтага павінны імкнуцца».

Па меркаванні спікера, ад таго, як працуюць школы і дашкольныя ўстановы, залежыць многае. «Будучыня краіны — у руках моладзі, — звярнулася Старшыня Савета Рэспублікі да педагагічнай супольнасці. — І ваша праца няпростая, але вельмі ўдзячная. Для нас настаўнік заўсёды быў тым, з каго мы бралі прыклад. Мы заўсёды падобраму згадваем сваіх настаўнікаў, якія заклалі адносіны да тых або іншых падзей».

Наталля Качанава выказала ўдзячнасць выхавацелям і настаўнікам за тое, што яны робяць для краіны, выхоўваючы падрастаючае пакаленне, перадаючы яму розум, талент і веды. Аднак, як акцэнтавала ўвагу спікер, не варта арыентавацца выключна на таленавітых дзяцей. «Трэба дайсці да кожнага дзіцяці, трэба ўбачыць кожнае дзіця», — паставіла задачу Старшыня Савета Рэспублікі.

Дашкольныя ўстановы — на новы ўзровень

Дакладваючы аб перспектывах развіцця адукацыі, **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ** спыніўся на праблемных момантах дашкольнай адукацыі. Сёння прымаюцца ўсе неабходныя меры па павышэнні крокавай даступнасці навучальных устаноў для самых маленькіх грамадзян. Аднак, па меркаванні кіраўніка ведамства, вельмі важна ўважліва паглядзець і на пытанне камплектавання дашкольных устаноў педагагічнымі супрацоўнікамі. Ёсць нямала вакантных пасад, таму пастаўлена задача дакамплектаваць дзіцячыя сады выхавацелямі.

«Падрыхтоўка адпаведных педагогаў знаходзіцца поўнасцю ў руках сістэмы адукацыі горада Мінска, — адзначыў Андрэй Іванец. — Міністэрства адукацыі поўнасцю адкрыта, гатова павялічваць кантрольныя лічбы прыёму ў педагагічныя каледжы для падрыхтоўкі адпаведных спецыялістаў».

Асобна абмяркоўвалася пытанне абсталявання матэрыяльна-тэхнічнай базы дзіцячых садоў. «Мы сур'ёзную ўвагу ўдзяляем школам, але не заўсёды належным чынам звяртаем увагу на ўстановы дашкольнай адукацыі, — заявіў міністр. — Сёлета сур'ёзныя сродкі накіраваны на матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне нашых садкоў — каля мільёна рублёў. Мяркуем, што гэтую работу трэба вывесці на прынцыпова новы ўзровень».

Кажучы аб неабходнасці прафільных класаў у сістэме агульнай сярэдняй адукацыі, кіраўнік ведамства заўважыў, што стварэнне інжынерных класаў у школах з гэтага года пераследуе некалькі мэт. «Гэта не толькі пытанне падрыхтоўкі будучых інжынераў, прафарыентацыйная работа, — удакладніў ён. — У першую чаргу гэта магчымасць закрыць патрэбу ў настаўніках фізікі, матэматыкі, інфарматыкі. Калі мы хаця б 10 % выпускнікоў інжынерных класаў накіруем на педагагічныя спецыяльнасці менавіта на гэтыя прадметы, то зможам закрыць усе неабходныя патрэбы».

Падчас педагагічнага форуму абмяркоўваўся шырокі спектр пытанняў, актуальных для сістэмы адукацыі. І калі па некаторых з іх адзінства меркаванняў не было, то ў тым, што сістэма адукацыі павінна быць адаптаваная да пытанняў сённяшняга, а то і заўтрашняга дня, упэўнены ўсе прадстаўнікі педагагічнай супольнасці сталіцы.

Вераніка КАНЮТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

БЛІЗКА ДА СЭРЦА

«Звароты грамадзян»... Гучыць афіцыйна, фактычна без эмоцый. Але за гэтымі двума словамі — гісторыі, праблемы, пытанні асобна ўзятых людзей, якія спадзяюцца на дапамогу. Якія пішуць, тэлефануюць, прыходзяць на прыём да прадстаўнікоў улады як да апошняй інстанцыі.

Члены Савета Рэспублікі працуюць са зваротамі людзей пастаянна. Літаральна кожны тыдзень хтосьці з сенатараў праводзіць прамую лінію або асабісты прыём — і ў сталіцы, і ў рэгіёнах. Добрай практыкай стала і правядзенне Адзінага дня прыёму ў той ці іншай вобласці, калі ўвагай членаў Савета Рэспублікі ахопліваюцца ўсе раёны.

Людзі звяртаюцца, таму што вераць і давяраюць. Гэты давер узмацняецца, калі відаць рэальныя справы, рэальную дапамогу ў вырашэнні таго ці іншага пытання.

Мы сабралі некалькі гісторый з розных рэгіёнаў краіны, дзе праблемы вырашыліся дзякуючы неабыякавасці і актыўнаму ўдзелу парламентарыяў.

Анёлы-ахоўнікі для сацыяльнай установы

Цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі існуе ў Касцюковічах з 2001 года. Для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ён, лічы, родны дом. Тут яны маюць магчымасць кантактаваць, развіваць свае здольнасці, вучыцца, адпачываць, спраўляць святы. На базе цэнтра створаны тры спецыяльныя класы і тры дашкольныя групы. З улікам навічка, які прыйдзе сюды 1 верасня, колькасць выхаванцаў павялічыцца да 30 дзяцей. Сёлета ўстанова атрымала магчымасць пераехаць у новы, больш камфортны і функцыянальны будынак. Гэта рэканструяваная пабудова былога дзіцячага садка па вуліцы Максіма Горкага. Цудоўна, што цяпер ёсць новыя памяшканні і тэрыторыі, дзе дзецям будзе зручна гуляць і займацца. Раней былі праблемы з абсталяваннем для спецыялізаваных пакояў, але яны ўжо цалкам вырашаныя.

— Па патрабаваннях у пакоі псіхолага медыка-педагагічнай камісіі павінна быць відэаназіранне і люстэрка Гезела, — расказвае **дырэктар цэнтра Ларыса ДАНІЛОВІЧ**. — Я звярнулася да нашага **сенатара Віктара Міхайлавіча АНАНІЧА**, і ён нас пачуў. Была выдзелена спонсарская дапамога ў памеры больш чым 7,5 тысячы рублёў, і мы набылі ўсё неабходнае. Падчас звароту я таксама паведаміла пра дрэнны стан шарыкавага басейна для дашкольнай групы, які ўжо амаль цалкам прыйшоў у непрыдатнасць і патрабаваў замены. Акрамя таго, у нас не было трымера, каб даглядаць тую вялікую тэрыторыю, якая ў нас з'явілася. Нас ужо папярэдзілі, што і басейн, і трымер нам перададуць на Дзень ведаў, які супаў для нас з навасаллем. І ў якасці ганаровых гасцей мы чакаем Віктара Ананіча і супрацоўнікаў «Беларусбанка».

Са старшынёй праўлення «Беларусбанка», намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Віктарам Ананічам установа супрацоўнічае з 2020 года. Першы раз Ларыса Даніловіч звярнулася да сенатара з просьбай дапамагчы набыць абсталяванне для сэнсарнай інтэграцыі. І дапамога не прымусіла сябе доўга чакаць.

— Нам перадалі фібераптычны душ «Светлавы дождж», праектар «Мора», шар, які свеціцца, светлавую пясочніцу, гульні на тактыльныя адчуванні і іншыя прадметы, — расказвае Ларыса Міхайлаўна. — Было вельмі прыемна, што сенатар паўдзельнічаў у жыцці нашых дзяцей і ўсё, чаго нам не хапала, мы набылі. Урачыстае адкрыццё пакоя адбылося з удзелам Віктара Міхайлавіча і супрацоўнікаў «Беларусбанка». Спонсарская дапамога была аказана ў рамках нашага праекта «Вектар дабрыні».

За апошнія тры гады пры непасрэдным удзеле сенатара Касцюковіцкі Цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі ператварыўся ў сучасную установу. Спонсары дапамаглі абнавіць мэблю, набылі кухню для кабінета сацыяльна-бытавой адаптацыі. А нядаўна цэнтру перадалі камп'ютары, якія былі патрэбныя навучэнцам тутэйшых спецыялізаваных класаў.

— Дзякуючы клопату Віктара Міхайлавіча мы штогод атрымліваем карысныя рэчы і падарункі, — адзначае суразмоўніца. — Сябруем і з магілёўскім абласным упраўленнем № 700 «Беларусбанка», яго супрацоўнікі таксама радуюць нас падарункамі. Хочацца сказаць шмат цёплых слоў у адрас нашых дабрадзеяў. Мы іх называем не інакш, як нашы анёлы-ахоўнікі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Ларысы ДАНІЛОВІЧ.

«Так хочацца жыць у сваім доме...»

Калі я даведалася, што жыхарка Віцебска хоча падзякаваць сенатару за дапамогу ў добраўпарадкаванні мікрараёна, то перад вачыма ўзніклі новая дзіцячая пляцоўка або пешаходныя дарожкі. Аказалася, што за гісторыяй Анастасіі Шолбінай стаяць восем гадоў неразумення і страчаных надзей.

У Віцебску будуецца новы мікрараён «Арэхава» на 270 участкаў для сем'яў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Такі ўчастак у 2015 годзе атрымала сям'я Анастасіі Шолбінай, у якой на той момант выхоўваліся двое дзяцей. Тады ў мікрараёне не было ніякіх камунікацый і дарог — толькі поле і балоты. Прайшло восем гадоў, сям'я Шолбіных стала шматдзетнай, але заехаць у новы дом яны не могуць, як і дзясяткі іншых сем'яў, у некаторых з якіх выхоўваюцца цяжкахворыя дзеці.

Будаўніцтва «Арэхава» раздзялілі паміж сабой чацвёра генпадрадчыкаў, напэўна, гэты факт якраз значна і запаволіў рабочы працэс: заказчык і арганізацыі не могуць дамовіцца аб канкрэтных тэрмінах выканання работ. Ні святла, ні газу, ні ацяплення, ні вады, ні дарог — за восем гадоў змяніўся толькі прыродны свет навокал участкаў: на вуліцы Анастасіі пасяліўся бабёр, на суседняй — качкі, у адну з сажалак мясцовыя аматары ціхага палявання запусцілі рыбу. Усе рамонтныя работы сям'я Анастасіі, як і суседзі, праводзіць з генератарам, які даводзіцца цягаць ад аўтамабіля да дома на сабе — у бездараж грунтавая дарога пад'ехаць да ўчасткаў не дазваляе.

Жыхары «Арэхава» на працягу доўгіх гадоў складалі індывідуальныя і калектыўныя пісьмы ў Віцебскі гарадскі выканаўчы камітэт, у камітэт архітэктуры і будаўніцтва, дайшлі і да галіновага міністэрства, аднак узнікалі пэўныя прычыны, чаму будаўніцтва спынялася: не было фінансавання, а калі сродкі з'яўляліся, то падрадчыкі ўжо былі занятыя на іншых аб'ектах. У лістападзе 2021 года працэс зрушыўся з мёртвага пункта, а потым зноў запаволіўся. Тэрміны выканання работ па пракладцы камунікацый пераносіліся з квартала на квартал.

«У канцы красавіка бягучага года мы звярнуліся да **члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Аляксея НЯВЕРАВА**, які праводзіў прамую тэлефонную лінію. Нас выслухалі і ўпершыню за доўгі час далі аператыўны адказ, накіраваўшы наш зварот **Юрыю ДЗЕРКАЧУ, члену Савета Рэспублікі сёмага склікання ад Віцебскай вобласці**, бо на месцы кантраляваць сітуацыю лягчэй. І, нарэшце, наша праблема пакрысе пачала вырашацца», — расказвае гераіня.

5 мая Юрый Мікалаевіч сумесна з кіраўніцтвам горада, заказчыкам і падраднымі арганізацыямі выехаў на месца ў «Арэхава». Шэраг пытанняў, якія назапасіліся за восем гадоў, стаў яшчэ большы. Высветлілася, што добраўпарадкаванне дарогі — яе адсыпанне і будаўніцтва дрэнажна-помпавай станцыі — увогуле не было аддадзена на выкананне генпадрадчыку. Сенатар даў адпаведныя ўказанні. Па факце апошняга паступлення сродкаў не былі вызначаны новыя тэрміны выканання работ, будаўнічыя арганізацыі адмаўляліся выводзіць тэхніку на палі. Пасля іх устанаўлення — а пракласці камунікацыі, акрамя святла, павінны былі да 18 жніўня — падрадчык з трох пунктаў выканаў толькі адзін на 20 працэнтаў. Чарговая сустрэча сенатара з адказнымі — і 17 жніўня ў мікрараёне зноў пачала працаваць тэхніка.

«Хочацца выказаць словы глыбокай падзякі Юрыю Мікалаевічу за тое, што ён не абмінуў нашу праблему і працягвае заставацца ў працэсе, выязджаючы з мэтай кантролю на месца, дамаўляецца з заказчыкам і падрадчыкамі, паскараючы будаўніцтва. Калі ўсё ж такі на суседняй вуліцы пачалі засыпаць дарогу, прыходзілася дамаўляцца з ДАІ. За чатыры ночы пралажылі газ — таксама ўзнікалі пэўныя складанасці з перакрываннем дарог, аднак усё вырашылася. Спадзяёмся, што да канца года ўсе камунікацыі будуць пракладзены і дарогі адсыпаны», — адзначае Анастасія.

За адной асабістай гісторыяй сям'і Шолбіных стаіць агульная праблема жыхароў усіх 270 участкаў. Людзям літаральна няма дзе жыць: пакуль сям'я гераіні жыве ў маці, на пяць чалавек прыходзіцца 30 квадратных метраў. Аднак жанчына знаходзіць у такой сітуацыі пазітыўны бок — яны не плацяць за здымнае жыллё ў адрозненне

ад іншых. Так, напрыклад, іх суседзі на ўчастку, якія выхоўваюць дзяўчынку з ДЦП, вымушаныя здымаць кватэру ў горадзе, хоць у іх пабудаваны дом, у якім нельга жыць. У некаторых сем'яў, што атрымалі крэдыт на будаўніцтва з субсідыяй па Указе № 240, за восем гадоў падышоў тэрмін выплаты асноўнага доўгу, а дом так і не здадзены ў эксплуатацыю.

Нягледзячы на тое, што на ўчастку Анастасіі ўжо пракладзены камунікацыі, яна з дапамогай сенатара спадзяецца давесці працэс да канца ва ўсім мікрараёне, бо пакуль камунікацыі не будуць закальцаваныя, ні адзін дом не ўвядуць у строй. Сям'я спадзяецца, што з «глытком свежага паветра» — так жанчына характарызуе дапамогу сенатара — будаўніцтва нарэшце завершыцца, бо так хочацца жыць у сваім доме...

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота з архіва гераіні.

Не касметычны рамонт, а капітальны

Будынак ФАПа ў вёсцы Беразцы Пінскага раёна зусім не новы. Тут ніколі раней не было, напрыклад, вады. Яе медработнікі прыносілі з найбліжэйшага калодзежа. Цяпер сельская медыцынская ўстанова перажывае капітальны рамонт і поўнае абнаўленне. Дапамог у гэтым член Савета Рэспублікі.

— Вясной я звярнулася да нашага **сенатара, дырэктара ААТ «Парахонскае» Уладзіміра ХРАЛЕНКІ** з просьбай дапамагчы зрабіць касметычны рамонт на ФАПе, — гаворыць **загадчыца Парахонскай участковай бальніцы Таццяна ЛАЎРЭНКА**. — Як заўсёды, Уладзімір Фёдаравіч адгукнуўся на просьбу. Былі закуплены фарба, шпалеры, іншыя матэрыялы. У выніку касметычнага рамонту будынак павінен быў пасвяжэць і папрыгажэць. Яшчэ была дамоўленасць падвесці ваду на ФАП, бо вада ў медыцынскай установе — у ліку найпершых патрэб.

Але ў маі, як вядома, у краіне прайшла вялікая нарада па актуальных пытаннях аховы здароўя, на якой кіраўнік дзяржавы асаблівую ўвагу ўдзяліў вёсцы. Было сказана, што не варта праводзіць аптымізацыю агулам, там, дзе ёсць сотня і больш чалавек, ФАПы павінны працаваць. Быў абазначаны і тэрмін навядзення парадку ў дадзенай сферы — да пачатку наступнага года.

Спецыялісты Пінскай цэнтральнай раённай паліклінікі разам з будаўнікамі, архітэктарамі, санітарнай службай і іншымі зацікаўленымі ведамствамі вывучылі стан кожнай сельскай медыцынскай установы, вызначылі фронт работы, які аказаўся надзвычай вялікім. З 39 фельчарска-акушэрскіх пунктаў раёна 36 мелі патрэбу ў рамонце, некаторыя трэба было пераносіць у іншыя памяшканні. Калі дайшла чарга да вырашэння лёсу Беразцоўскага ФАПа, як заўсёды, сенатар Храленка не застаўся ўбаку. Было прынята рашэнне правесці капітальны рамонт будынка, аб'яднаўшы намаганні цэнтральнай паліклінікі і ААТ «Парахонскае».

— Цяпер актыўна вядзецца работа, — расказвае **фельчарка Беразцоўскага ФАПа Алеся**

АСІПЕНКА. — Наш фельчарска-акушэрскі пункт — адзін з самых аддаленых у раёне, да Пінска ад вёскі — добрыя 50 кіламетраў. Да Парахонска, найбліжэйшай медустановы, адлегласць складае 25 кіламетраў, аўтобус ходзіць тры разы на тыдзень. Са 160 чалавек, жыхароў дзвюх вёсак — Беразцы і Маладзельчыцы, якія прыпісаныя да ФАПа, большасць складаюць пажылыя людзі. Для іх медыцынская дапамога асабліва актуальная. Мы не маглі дазволіць сабе закрыць ФАП нават на кароткі час рамонту. Таму работа ўстановы сумяшчаецца з рамонтам, які вядзецца паэтапна. Працуе будаўнічая брыгада ААТ «Парахонскае».

Прыемна бачыць, як наша медыцынская ўстанова ператвараецца на вачах, — працягвае спецыялістка. — Ужо заменены вокны і дзверы, кладзецца новая падлога, з'явіўся новы дах, вядуцца работы па адстройванні. Паколькі будынак стары, блочны, спецыялісты прызналі, што электрычнага ацяплення будзе мала. Таму вырашана пакінуць печкі, толькі падрамантаваць іх, а яшчэ ўстанавіць электрычныя батарэі-абагравальнікі ў кабінетах. Адным словам, працаваць гэтай зімой будзе максімальна камфортна. Ну і той факт, што кабінеты стануць утульнымі, светлымі, прыгожымі, дабаўляе настрою і жадання працаваць.

— Наш сенатар — гэта наша самая хуткая дапамога, — гаворыць **урач Таццяна ЛАЎРЭНКА**. — У склад Парахонскай участковай бальніцы ўваходзяць яшчэ паліклініка і чатыры ФАПы. Калі нешта тэрмінова патрабуецца для любой з медустаноў, звяртаюся да Уладзіміра Фёдаравіча. І ніколі не было адмовы. Некалькі гадоў таму з дапамогай гаспадаркі памянялі падлогу ў паліклініцы. Не так даўно ў якасці спонсарскай дапамогі сельгаспрадпрыемства набыло сучасны мікраскоп для лабараторыі. Падчас пандэміі мы мелі ўсё неабходнае дзякуючы менавіта нашым спонсарам. Ды і любы бягучы рамонт не абыходзіўся без іх дапамогі. Сведчанні сацыяльнай накіраванасці палітыкі буйнога сельгаспрадпрыемства і сенатарскага клопату — цяперашні рамонт Беразцоўскага ФАПа.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Беразцоўскага ФАПа.

Не ведаючы, набыла кватэру пад знос

Гісторыя Людмілы Васільевай са Смалявіч пачалася тры гады таму. Жанчына з сям'ёй набыла кватэру, але іх ніхто не папярэдзіў, што гэты дом пойдзе пад знос:

— Мы бралі вялікі крэдыт у банку на куплю кватэры, але не ведалі, што яна пойдзе пад знос. Нам пра гэта паведаміў Смалявіцкі райвыканкам, калі кватэра ўжо была набытая. Я звярталася ў райвыканкам, але пытанне не вырашалася. Пасля ўжо пачала пісаць звароты ў розныя інстанцыі. Але зноў жа нічога не змянілася. Тады я запісалася на прыём да **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяны РУНЕЦ**. І дзіва: пытанне вырашылася! Намеснік старшыні Смалявіцкага райвыканкама таксама прысутнічаў на гэтай гутарцы. У снежні нам выплацілі кампенсацыю, таму змагла пагасіць крэдыт у банку. Замест зношанага жылля далі арэнднае. Я вельмі ўдзячная Таццяне Аркадзеўне за аказаную дапамогу, пабольш бы такіх сенатараў!

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

НА ДУМКУ СЕНАТАРА

Патрэбныя будаўнікі, кухары, трактарысты...

Як задаволіць кадравы голад на прафесійных рабочых

Не сакрэт, што недахоп такіх спецыялістаў адчуваюць многія галіны эканомікі. Для таго каб упэўніцца ў гэтым, дастаткова адкрыць электронны банк вакансій. Аб'явы аб патрэбе работнікаў публікуюць перыядычныя і рэкламныя выданні. Відавочна, што менавіта рабочыя прафесіі найбольш запатрабаваныя.

А між тым прэстыж іх застаецца невысокім. І гэты перакос якраз і варта змяніць у сучасных эканамічных умовах, лічыць член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар Навагрудскага дзяржаўнага каледжа Эльвіра САРОКА.

— Рабочыя прафесіі заўсёды запатрабаваныя. Вось толькі прэстыж іх не на высокім узроўні, — лічыць яна. — Між тым краіна ўзяла курс на паскоранае развіццё, і такія кадры вельмі патрэбныя як у прамысловасці, так і ў сельскай гаспадарцы. Гэтыя пытанні сёння ў полі зроку дэпутацкага корпуса, асабліва той аспект, які датычыцца замацаванасці маладых спецыялістаў.

— Сёння прадпрыемствы хочуць атрымаць падрыхтаванага спецыяліста...

— Перад каледжамі стаіць задача не проста падрыхтаваць работніка, а выпусціць кваліфікаванага спецыяліста высокага прафесійнага ўзроўню. На гэта скіраваны і самі ўстановы адукацыі. У нашым Навагрудскім каледжы мы заўсёды падтрымліваем тых, хто імкнецца атрымаць веды па рабочых спецыяльнасцях, бо яны запатрабаваныя ў эканоміцы. Гэта спецыялісты грамадскага харчавання, трактарысты, кіроўцы, краназаўшчыкі, будаўнікі і іншыя. Аб прэстыжы дадзеных спецыяльнасцяў сведчыць і конкурс, у тым ліку ў нашым каледжы. Мы ўбачылі, што да гэтага павярнуліся тварам як бацькі, так і дзеці.

— Як вядома, многія пры паступленні шукаюць плюсы будучай работы, у першую чаргу, узровень зарплаты, сацыяльную падтрымку. Але тут яшчэ варта ўлічваць і такі аспект, як магчымасць знайсці сабе справу даспадобы. Як абітурыентам разабрацца ў гэтым?

— Мы, па-першае, праводзім прафарыентацыйную работу з дзецьмі свайго і суседніх раёнаў, дзе навучэнцы каледжа дзеляцца сваім вопытам, расказваюць аб сабе. Праводзяцца майстар-класы, падчас якіх можна паспрабаваць сябе ў прафесіі, напрыклад, сесці за руль аўтамабіля ці трактара, прыгатаваць нейкія кулінарныя вырабы, сервіраваць стол. А самым дзейсным, на мой погляд, з'яўляецца паступленне дзяцей тых, хто сам тут вучыўся. Я працую ўжо 25 гадоў, і сёння мае выпускнікі прыводзяць сваіх дзяцей. Гэта радуе, прычым з кожным годам такіх дзяцей усё больш і больш.

— Многія пры паступленні ў каледжы хочуць бачыць свае пункты росту. Наколькі тое магчыма?

— Каб прыцягнуць школьнікаў у рабочыя прафесіі, мы паказваем, што гэты ўзровень можна ўдасканальваць. Напрыклад, удзельнічаць у конкурсах прафесійнага майстэрства як самім навучэнцам, так і школьнікам, якія атрымліваюць у нас дадатковую адукацыю. Тым самым паказваем, якога ўзроўню можна дасягнуць, калі любіш сваю прафесію і не спыняешся на дасягнутым. Усе нашы дасягненні мы выкладваем у сацыяльных сетках, на сайтах, і гэта аб многім гаворыць.

— Наколькі ахвотна бяруць выпускнікоў наймальнікі? Ці зацікаўленыя яны ў мэтавым накіраванні? Зразумела, што для навучальнай установы такая форма вельмі спрыяльная.

— Мы разумеем, што пасля заканчэння нашы выпускнікі павінны быць працаўладкаваны. Мы на 100 % даём працоўнае месца і бачым, як яны замацоўваюцца, дапамагаем ім, сочым за тым, каб яны мелі сацыяльны пакет, вырашаем нейкія юрыдычныя пытанні. Заканадаўствам замацаваныя нормы для маладых спецыялістаў, у тым ліку фінансавы стымул, дапамога на працоўным месцы, сацыяльныя гарантыі. Усё гэта важна, у тым ліку і мэтавая падрыхтоўка, калі рыхтуюць спецыялістаў пад заказ па заяўках і дагаворах з прадпрыемствамі і арганізацыямі. Наймальнік упэўнены, што канкрэтны спецыяліст гарантавана прыйдзе на работу. Адпрацоўка па мэтавым накіраванні складае два гады, без накіравання — год.

На жаль, не заўсёды заказчыкі кадраў працуюць з намі супольна. Некаторыя лічаць, што будучых спецыялістаў павінны шукаць менавіта навучальныя ўстановы. Зразумела, было б добра, каб заказчыкі кадраў правялі работу сярод сваіх работнікаў, у якіх дзеці — выпускнікі. Менавіта такі кантынгент найбольш жаданы, бо гэтыя спецыялісты вернуцца на сваю радзіму, дзе яны ўсё ведаюць. Ім будзе лягчэй пры бацьках будаваць свой працоўны і асабісты лёс. Але пакуль колькасць такіх вучняў невялікая. Іншым разам заказчыкі падыходзяць да справы фармальна. Хацелася б, каб яны больш актыўна бралі ўдзел у нашых прафарыентацыйных мерапрыемствах.

— Ці ёсць конкурс у каледжах? Якія прафесіі папулярныя сярод навучэнцаў?

— У нашым каледжы сёлета быў конкурс на спецыяльнасць «грамадскае харчаванне». І ў іншых каледжах таксама. Папулярныя спецыяльнасці кіроўца-аўтаслесар, нават трактарыст, якія вельмі запатрабаваныя ў сельскай гаспадарцы. Вядома, дзеці павінны выйсці спецыялістамі. Адна бяда ў тым, што не хапае майстроў вытворчага навучання. Магчыма, гэта звязана з высокай адказнасцю і невялікай зарплатай.

У нас выпускаюцца спецыялісты грамадскага харчавання, трактарысты, газаэлектразваршчыкі, кіроўцы катэгорыі «С». Для хлопцаў гэта вельмі прэстыжна, ёсць магчымасць атрымаць правы. Ёсць прафесія дарожны рабочы, другі год рыхтуем машыністаў аўтамабільнага крана. Пакуль на згаданыя спецыяльнасці ідуць не вельмі ахвотна.

Маем шмат перамог у кухарскіх конкурсах, моцная кафедра грамадскага харчавання і мы хацелі б адкрыць на ўзроўні сярэдняй адукацыі падрыхтоўку па спецыяльнасці «кухар 5-га разраду». Як правіла, у прэстыжныя ўстановы патрабуецца кухар высокай кваліфікацыі.

— Пытанні падрыхтоўкі рабочых спецыялістаў абмяркоўваюцца заканадаўчымі органамі ўлады?

— Такія сустрэчы праводзяцца з удзелам кіраўніцтва вобласці, дэпутацкага корпуса. Усе разумеюць важнасць падрыхтоўкі рабочых кадраў. Напрыклад, на пасяджэнні Савета Рэспублікі мы паказвалі падрыхтоўку ў тым ліку і нашага каледжа, патэнцыял якога даволі высокі. Мы ўсе разумеем, што тут важна ўлічваць яшчэ і патрыятычны аспект. Прафесія прафесіяй, але будучы спецыяліст павінен любіць працу, быць грамадзянінам сваёй краіны, і на гэта мы робім акцэнт. Нашы заказчыкі так і кажуць: вы навучыце іх асновам справы, жаданню працаваць і спасцігаць новае, каб яны адчулі любоў да сваёй прафесіі, а працаваць на новай тэхніцы мы і самі на вытворчасці навучым.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота дадзена Навагрудскім каледжам.

СТРАТЭГІЯ НА ПАЛЯПШЭННЕ ЖЫЦЦЯ

Мсціслаўскія дэпутаты разгледзелі перспектывы ўстойлівага развіцця на найбліжэйшыя дзесяць гадоў

Аціаніць патэнцыял раёна можна было на пляцоўцы раённага Цэнтра дзіцячай творчасці, дзе прайшло выязное пасяджэнне прэзідыума Мсціслаўскага райсавета дэпутатаў з удзелам прадстаўнікоў кіраўніцтва райвыканкама. На выставе былі прадстаўлены праекты і ініцыятывы, якія рэалізоўваюцца на тэрыторыі раёна ўстановамі адукацыі, культуры і турызму. І вельмі ярка ў іх прадстаўлена тэма малой радзімы, яднання і патрыятызму. Акцэнт зроблены на традыцыі і народнасць.

— Наша сумесная работа з установамі і арганізацыямі яшчэ раз паказала, наколькі лёс малой радзімы важны для нашых жыхароў, — падкрэсліла падчас пасяджэння **старшыня Мсціслаўскага райсавета дэпутатаў Алена КЛЕЯНКОВА.**

Намеснік старшыні Мсціслаўскага райвыканкама Вольга СУДЗІЛОЎСКАЯ адзначыла, што гэта якраз і з'яўляецца асновай канцэпцыі стратэгіі ўстойлівага развіцця Мсціслаўскага раёна да 2035 года.

— Усе намаганні людзей, суб'ектаў гаспадарання і ўсіх структур павінны быць аб'яднаныя на карысць мэты зрабіць наш край зручным для жыцця, — канстатавала яна. — У будучым мы бачым раён экалагічна здаровым рэгіёнам міжсектарнага супрацоўніцтва і ўстойлівага турызму.

Агульная канцэпцыя ўстойлівага развіцця раёна супадае з лакальнай канцэпцыяй устойлівага развіцця Ходасаўскага сельсавета, пра што на пасяджэнні паведаміў **дэпутат сельсавета, дырэктар Ходасаўскай школы Сяргей ФЯДОСАЎ.**

— Стратэгія, якой сёння мы прытрымліваемся ў развіцці нашага сельсавета, ажыццяўляецца на аснове сумесных ініцыятыў, накіраваных на паляпшэнне якасці жыцця ў вёсцы, — рэзюмаваў ён. — Удзел у яе рэалізацыі бяруць і педагогі, і навучэнцы нашай школы. Ідэй ад насельніцтва паступае заўсёды шмат. І мы іх паступова рэалізоўваем, каб зрабіць наша агульнае жыццё больш камфортным і цікавым.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва раённай газеты «Святло Кастрычніка».

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.431. Нумар падпісаны ў 19.30 29 жніўня 2023 года.

ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Рокат-групп»

(УНП 193220892, Витебская обл., Витебский р-н, г. Витебск, ул. Политехническая, д. 5

(мансардный этаж в капитальном строении, инв. № 200/с-43012), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

***Дата и время проведения торгов*: 14 сентября 2023 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 30 августа 2023 года по 12 сентября 2023 года.
Место проведения торгов: г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».
Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.
Продавец: **ООО «Рокат-групп» (УНП 193220892)** в лице антикризисного управляющего – директора ООО «ЮрЛиния» В.Н. Павловской.

№ лота	Предмет торгов	Начальная цена, рублей без учета НДС	Шаг торгов	Задаток
1	Капитальное строение с инв. № 600/С-102835, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Загородная, 1, площадь – 0,0 кв. м, назначение – Сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – Сооружение артезианской скважины, возникновение прав, ограничений (обременений) прав на кап. строение (ипотека), правообладатель – ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк»	8 730,00	5 %	2 %
2	Капитальное строение с инв. № 600/С-165132, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Загородная, 1, площадь – 0,0 кв. м, назначение – Сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – Навес цементного склада с шиферной крышей, возникновение прав, ограничений (обременений) прав на кап. строение (ипотека), правообладатель – ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк»	36 180,00	5 %	2 %
3	Капитальное строение с инв. № 600/С-102842, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Загородная, 1, площадь – 1303,0 кв. м, назначение – Сооружение неустановленного назначения, наименование – Цементобетонная площадка, возникновение прав, ограничений (обременений) прав на кап. строение (ипотека), правообладатель – ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк»	262 800,00	5 %	2 %
Сведение о земельном участке: кадастровый номер 623650100001005243, площадь 0,8807 га, целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания производственно-складской базы, на праве постоянного владения (пользования) землей				
Примечание: земельный участок имеет ограничения (обременения) прав на использование земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема), код – 2,4, площадь – 0,8807 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 0,0450 га				

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок до 16.00 **12 сентября 2023 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования **до 16.00 12.09.2023** заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Нарочанская, д. 11-2, пом. 406.

Контактное лицо для осмотра лотов: Яскевич Дмитрий Васильевич, тел. 8 (029) 684-71-76.

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;

- на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 138 (30018) за 20.07.2023 г.

Центр Промышленной Оценки • Организация аукционов • Оценка всех видов имущества

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607
Продавец	ОАО «Сукно», г. Минск, ул. Матусевича, д. 33. Тел. +375 (17) 363-99-40

Извещение о проведении открытого аукциона	**Дата, время проведения аукциона**	**Срок подачи заявления на участие в торгах**
Предмет аукциона: 1. Имущество, реализуемое одним лотом по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33/2-3 (Производственное помещение, инв. номер 500/D-7988200132, общей площадью 12 927 кв. м и иное имущество, входящее в состав лота). 2. Производственное помещение, инв. номер 500/D-7988200131, общей площадью 18 564,9 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33/2-1 (в состав лота входит иное имущество). 3. Имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33. 4. Дебиторская задолженность ОАО «Сукно» в количестве 45 лотов по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33. **Полный состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона www.cpo.by**	**15.09.2023 в 14.00**	**с 9.00 30.08.2023 до 17.00 14.09.2023**

Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1607, ЗАО «Центр промышленной оценки»

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяются ст. ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

Срок подписания договора купли-продажи	**5 (пять) рабочих дней** после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **15 (пятнадцати) дней** со дня проведения аукциона **(по лотам №№ 1–3) и 10 (десяти) дней** со дня проведения аукциона (по лоту № 4), если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере от 0,5 до 10 % от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов не менее, чем за день до наступления даты проведения торгов без объяснения причин снятия

Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by
Продавец	ООО «ГрандЛесТорг», 213410, Могилёвская обл., г. Горки, ул. Мира, д. 14

Предмет электронных торгов: недвижимое имущество, реализуемое одним лотом
Местоположение: Могилевская обл., Горецкий р-н, г. Горки, ул. Вокзальная, 11М, 11Н, 11Б

Магазин «Сельхозпродукты» (Здание специализированное розничной торговли), инв. № 720/С-12722, общ. пл. 89,9 кв. м. Составные части и принадлежности: неотапливаемая пристройка, котельная, крыльцо. **Контора** (Здание административно-хозяйственное), инв. № 720/С-12721, общ. пл. 102,5 кв. м. Составные части и принадлежности: неотапливаемая пристройка. **Мясной павильон** (Здание специализированное розничной торговли), инв. № 720/С-12720, общ. пл. 153,3 кв. м. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание павильона. **Асфальтобетонное покрытие рынка** (Сооружение неустановленного назначения), инв. № 720/С-16456, общ. пл. 0 кв. м. Составные части и принадлежности: три площадки, бордюр. ***Земельный участок*** общ. пл. 1,9010 га предоставлен продавцу для обслуживания существующих зданий и сооружений на праве постоянного пользования.

Начальная цена без НДС – 342 000,00 бел. руб.
Шаг торгов – 17 100,00 бел. руб.

Задаток 1 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десяти) рабочих дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Извещение о проведении предыдущих торгов опубликовано в газете «Звязда» от 21.07.2023 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
15.09.2023 г. с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **14.09.2023 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные даные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

Центр Промышленной Оценки • Организация аукционов • Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б (**www.ipmtorgi.by**)

Предмет электронных торгов

Четырехкомнатная квартира
(**80,4 кв. м,** инв. № 122/D-7119,
в состав квартиры входит кладовая в подвале).
Адрес: **Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. В. Клютко, 35-6**

Начальная цена лота (без НДС) – 48 879,42 бел. руб.
(снижена на 50 %)

Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущее извещении о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 03.08.2023 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
15.09.2023 с 11.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 14.09.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

---

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ООО «БТМ Трейдинг»** (УНП 192433644), объявляет о проведении **11.09.2023 г.** в 10.00 публичных торгов по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501.

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2023/08/btm-trejding110923.pdf

Продавец: ООО «БТМ Трейдинг».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **08.09.2023 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **30.08.2023** по 17.00 **08.09.2023** по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501.

К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета торгов по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты проведения торгов.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Затраты на организацию и проведение торгов составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре, публикация в СМИ – 115,53 бел. руб., аукционный сбор – 7 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %).

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 15 календарных дней с даты проведения торгов.

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ООО «СТМ Системс»** (УНП 192678578), объявляет о проведении **11.09.2023 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

Скажыце, доктар...

Ад праблем са скурай да раку

Чым небяспечны вірус папіломы?

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Вірус папіломы чалавека (ВПЧ) — адзін з самых загадкавых і вядомых адначасова. Ён выяўляецца на розных участках цела. Існуе больш за сотню відаў ВПЧ, некаторыя з якіх смяротна небяспечныя. Пра ВПЧ сёння гавораць часта і шмат, большую частку насельніцтва планеты ў асноўным хвалюе, ці можа ён выклікаць злаякасную пухліну і якія наступствы пагражаюць арганізму чалавека. Пра гэта размаўляем з урачом — акушэрам-гінекалагам 1-й катэгорыі Вольгай ПРАХАРЭНЯЙ.

— Вольга Сяргееўна, вядома, што ёсць шмат разнавіднасцяў віруса папіломы чалавека. Якія з іх самыя небяспечныя і чым?

— З ВПЧ можа сутыкнуцца любы чалавек. Лічыцца, што 80 % насельніцтва цягам жыцця хоць раз з ім сустракаецца. Існуе ў каля 120 тыпаў, і розныя тыпы адказваюць за ўзнікненне розных захворванняў. Напрыклад, ВПЧ 1, 2, 3, 4 тыпаў выклікае бародаўкі на падэшве, якія нагадваюць мазалі і, адпаведна, перадаюцца пры кантакце праз заражаныя прадметы. 6, 11, 13, 16, 18, 31, 33, 35 тыпы выклікаюць анагенітальныя бародаўкі палавых органаў і іх захворванні, у тым ліку і рак шыйкі маткі. Асабліва небяспечныя 16 і 18 тыпы. 10, 28, 49 тыпы выклікаюць плоскія бародаўкі, 27 — звычайныя бародаўкі.

Трэба сказаць, што самыя небяспечныя — 16, 18, 30, 31, 33, 39, 40, 42, 43, 52, 55, 57, 58, 59, 61, 62, 67, 68, 69 тыпы. Яны лічацца ВПЧ высокай канцэрагеннасці, бо верагоднасць таго, што пры заражэнні гэтымі вірусамі разаўецца рак шыйкі маткі, высокая. Яны таксама пашкоджваюць насаглотку, органы мочавыдзяляльнай сістэмы, геніталіі.

Каля 90 % анагенітальных бародавак выклікаюць нізкаанкагенныя тыпы — 6 і 11. А вось рак шыйкі маткі на 90 % выпадкаў звязаны з ВПЧ 16 і 18 тыпаў. Вылучаюць высокі і нізкаанкагенны тыпы, але гэта дзяленне ўмоўнае, бо злаякасны працэс можа развівацца і пры тых, і пры іншых.

— Як перадаецца ВПЧ?

— Калі ў сям'і ў кагосьці ёсць ВПЧ, які выклікае бародаўкі на целе, то яны могуць узнікнуць у іншых членаў сям'і — пры кантакце са скурай, праз агульныя прадметы, напрыклад тапачкі, ручнікі. Акрамя таго, вірус перадаецца праз лежакі на пляжы, поціск рукі, поруч. Таксама ВПЧ перадаецца палавым шляхам, у тым ліку пры петынгу, аральным і анальным сексе, пры любым цесным кантакце.

— Якія захворванні могуць узнікаць пры ВПЧ, акрамя раку шыйкі маткі?

— ВПЧ можа выклікаць звычайныя бародаўкі, часцей за ўсё яны з'яўляюцца на руках і нагах. Аднак тут усё залежыць ад імунітэту. Пры кантакце з ВПЧ у чалавека са зніжаным імунітэтам адбудзецца заражэнне і могуць узнікаць бародаўкі і папіломы, а пры добрым імунітэце пры кантакце з ВПЧ бародаўкі не ўзнікаюць і ніякіх змяненняў не будзе.

Генітальныя тыпы ВПЧ выклікаюць анагенітальныя бародаўкі ці, як іх яшчэ называюць, востраканечныя кандыломы. Гэта разрастанне ў выглядзе квяцістай капусты. Яны перадаюцца пры наяўнасці ў аднаго партнёра пры палавым кантакце ці праз той жа агульны ручнік. Самае небяспечнае праяўленне ВПЧ — узнікненне дысплазіі шыйкі маткі, перадракавага захворвання і непасрэдна раку шыйкі маткі. Пры добрым імунітэце дысплазія 1 ступені можа праходзіць самастойна, а можа прагрэсіраваць далей. Таксама ВПЧ выклікае рак глоткі, языка, палавога члена і анальны рак.

— Ці можа ВПЧ сам знікаць праз 1-2 гады? І ці ёсць у такім выпадку рызыка захварэць на рак шыйкі маткі?

— Пры трапленні ў арганізм ВПЧ жыве ў шматслойным плоскім эпітэліі — на самых верхніх слаях скуры і слізістых і глыбей не ідзе, калі не развіваецца пухліна. Таму ён можа знікаць самастойна, бо наша скура абнаўляецца, слізістая мяняецца, і звычайна абнаўленне адбываецца цягам 30 дзён. Са старымі клеткамі скуры адслойваюцца і зараженыя ВПЧ клеткі. Пры добрым імунітэце ВПЧ здольны знікнуць цягам трох гадоў у 70 % выпадкаў. Тады і рызыкі захварэць на рак шыйкі маткі няма — пры ўмове, што чалавек не заразіцца новым тыпам ВПЧ, якога ў яго не было дагэтуль.

Пры трапленні ў арганізм чалавека новы штам зноў пачынае пашкоджваць шматслойны плоскі эпітэлій. Працэс ідзе нанава. Ён зноў можа абарвацца, калі спрацуе імунітэт, а можа пайсці далей, аж да развіцця анкалагічнага захворвання.

— Ці азначае гэта, што, калі ты перахварэў на нейкі тып ВПЧ, верагоднасці яшчэ раз ім заразіцца няма?

— Пасля таго як перахварэў ці пралячыўся, пэўны тып ВПЧ знік і стаў адмоўным у аналізе. Але калі чалавек зноў кантактуе з тым жа самым тыпам ВПЧ, ён можа зноў узнікнуць і быць пазітыўным у аналізе.

— Як даведацца, што ў цябе ВПЧ?

— Калі з'явіліся папіломы на скуры, іх становіцца ўсё больш, то варта іх выдаліць у касметолага ці дэрматолага (у гінеколага, калі яны размешчаны на вонкавых палавых органах). Ёсць такая працэдура, як дэрматаскапія, яе праводзяць дэрматолагі ў незразумелых выпадках.

Калі маецца разрастанне ў выглядзе квяцістай капусты з няроўнай паверхняй, то варта западозрыць анагенітальныя бародаўкі. А вось змяненні на шыйцы маткі можа ўбачыць толькі гінеколаг на аглядзе, які абавязкова варта праходзіць штогод і здаваць анкацыталогію, а лепш вадкасную цыталогію — ПАП-тэст. Ён эфектыўны на самай ранняй стадыі, калі маюцца адзінкавыя перадракавыя клеткі ці адзінкавыя клеткі, пашкоджаныя ВПЧ.

Усім здаваць аналіз на ВПЧ без клінічных праяў неабавязкова, яго рэкамендуецца выконваць толькі пры наяўнасці паказанняў, ён бярэцца з цэрвікальнага канала ў жанчын і ўрэтры — у мужчын. На сёння ёсць два спосабы выявіць ВПЧ — якасны і колькасны. Якасны дазваляе адказаць на пытанне, ёсць ці няма ВПЧ сярод тых штамаў, на якія правяраем. Колькасны дазваляе выявіць, які канкрэтна ёсць тып ВПЧ і ў якой колькасці. Але трэба ўлічваць, што, як і ў любога іншага віруса, у ВПЧ ёсць інкубацыйны перыяд, ён складае прыкладна месяц, цягам якога аналіз можа быць адмоўны, а праз месяц пасля заражэння станавіцца станоўчым.

— Ці паддаецца ВПЧ лячэнню? Што рабіць, каля выявілі «квяцістую капусту»?

— Калі выявілі анагенітальныя бародаўкі, іх выдаляюць. Усё залежыць ад таго, якое захворванне выклікаў ВПЧ. Мы лечым не сам вірус пры яго наяўнасці, а змяненні, якія ён выклікае ў клетках арганізма. ВПЧ жыве ў шматслойным плоскім эпітэліі, і калі ўжо ён туды трапіў, то больш нідзе не цыркулюе, у адрозненне ад, скажам, віруса герпесу, а ўладкоўваецца ў плоскім эпітэліі.

З дапамогай розных метадаў (часцей выкарыстоўваецца радыёхваля) разбураюць пашкоджаныя ВПЧ клеткі, і адбываецца зажыўленне слізістай здаровым эпітэліем. І такім чынам ВПЧ знікае, аналіз становіцца адмоўным цягам паўгода пасля лячэння паталогіі на шыйцы маткі. Раней выкарыстоўвалі крыятэрапію: разбуралі пашкоджаныя клеткі з дапамогай нізкіх тэмператур. Як высветлілася пасля, гэта не знішчае вірус, таму працэдура пры ВПЧ неэфектыўная. Самае аптымальнае — выкарыстанне лазера ці радыёхвалі. Таксама прымяняецца электракаагуляцыя — уздзеянне электрычным токам, але пасля застаецца грубая рубцовая тканка, таму ад яго таксама варта ўстрымлівацца.

— Ці патрэбна вакцынацыя ад ВПЧ і ў якім узросце яна эфектыўная?

— Вакцынацыя патрэбна абавязкова. Гэта выдатны сродак прафілактыкі захворванняў, выкліканых ВПЧ. Найбольш эфектыўна, калі яна зроблена да пачатку палавога жыцця. Рызыкі захварэць ад самой вакцыны няма, бо гэта нежывы вірус, а генна-інжынерная распрацоўка. Вакцына актыўная супраць самых патагенных тыпаў ВПЧ — 16 і 18, а таксама 6 і 11, якія выклікаюць анагенітальныя бародаўкі.

У Аўстраліі з 2007 года праводзяць абавязковую вакцынацыю дзяўчынак ва ўзросце 10—12 гадоў, а з 2013 года там сталі прышчапляць і хлопчыкаў. І ў выніку узровень інфіцыравання ВПЧ упаў з 22,7 % да 1,1 %. А захваральнасць на рак шыйкі маткі знізілася на 50 %. Супрацьпаказанняў да вакцыны амаль няма, яе нельга выкарыстоўваць толькі падчас цяжарнасці. Пабочных эфектаў мала, можна і трэба яе праводзіць нават ВІЧ-інфіцыраваным. Вакцынацыя цалкам бяспечная. Калі ў чалавека ўжо ёсць ВПЧ, то яго ўсё роўна можна прышчапляць, бо такім чынам у яго з'явіцца абарона ад іншых тыпаў ВПЧ, якія ўтрымліваюцца ў вакцыне.

На сёння ў Беларусі ёсць дзве вакцыны супраць ВПЧ. Першая — двухвалентная прышчэпка вытворчасці Бельгіі. Гэта вакцына ад ВПЧ самых небяспечных, 16 і 18, тыпаў. 16 тып выклікае пласкаклетачны рак шыйкі маткі — пухліну з плоскага эпітэлію, 18 тып — адэнакарцэному шыйкі маткі з жалезістага эпітэлію. Прышчапляць гэтай вакцынай рэкамендуецца з 10 да 25 гадоў. Рызыка захварэць на рак шыйкі маткі ў тых, хто прышчэплены пасля 25 гадоў і непрышчэпленых, аднолькавая. Вакцына ўводзіцца ўнутрымышачна ў дэльтападобную мышцу. Згодна з інструкцыяй, другая прышчэпка робіцца праз месяц, трэцяя — праз паўгода пасля першай. З супрацьпаказанняў — толькі павышаная адчувальнасць да кампанентаў вакцыны.

Другая вакцына — чатырохвалентная вытворчасці ЗША. Яна абараняе ад 16 і 18 тыпаў ВПЧ, а таксама ад 6 і 11. Вакцынацыя робіцца па падобнай схеме 0-2-6. Паводле інструкцыі, яна прызначана з 9 да 45 гадоў. Паўтаруся, яе таксама лепш праводзіць з 9 да 25-26 гадоў.

Трэцяя вакцына дзевяцівалентная, яе ў Беларусі няма. Яна абараняе ад 16, 18, 6, 11, а таксама 31, 33, 45, 52 і 58 тыпаў. Яна паказана дзяўчатам з 16 да 26 гадоў, хлопцам — з 16 да 26 гадоў. Дазволена да выкарыстання ў дзяўчынак з 9 да 15 гадоў і хлопчыкаў такога ж узросту. Выконваецца гэтак жа па схеме 0-2-6 таксама ў дэльтападобную мышцу.

З пабочных эфектаў пасля прышчэпак выдзяляюць галаўны боль часам і прыпухласць у вобласці ўвядзення ўколу. З супрацьпаказанняў — павышаная адчувальнасць да кампанентаў вакцыны, востраe інфекцыйнае захворванне з тэмпературай больш за 38 градусаў, узрост да 9 гадоў, цяжарнасць.

У 2022 годзе СААЗ прыняла рашэнне, што дастаткова прышчапляць дзяўчат і хлопцаў 1-2 дозамі вакцыны: 1 прышчэпка, і праз паўгода — другая. Можна нават адну дозу, калі гэта робіцца да 20 гадоў. Калі пасля 21, то дзве дозы з інтэрвалам у паўгода. ВІЧ-інфіцыраваным патрэбна тры дозы.

— Раскажыце пра яшчэ адзін вірус — герпесу.

— Існуюць розныя тыпы віруса герпесу, самыя частыя — вірус 1 і 2 тыпаў. Першы найчасцей пашкоджвае скуру губ, слізістую носа, а 2 тып — палавыя органы, ён адносіцца да інфекцый палавых шляхоў. Але пры наяўнасці 1 тыпу можа адбыцца самазаражэнне пры пераносе рукамі. Такім чынам вірус 1 тыпа трапляе на палавыя органы і пераходзіць у генітальны герпес. Часты спосаб перадачы — гэта аральны сэкс. Пры вірусе герпесу 1 тыпу можа ўзнікаць хранічны генітальны герпес, трапіўшы такім спосабам, але ён радзей рэцыдыруе, чым герпес 2 тыпу. Частата ўзнікнення паўторных абвастрэнняў — 50 %, калі ён можа перайсці ў хранічны.

А вось герпес 2 тыпу ў 80 % выпадкаў пераходзіць у хранічны, які пастаянна нагадвае пра сябе рэцыдывамі і можа непакоіць абвастрэннямі кожны месяц. Праяўляецца ён у выглядзе пузыроў, якія вельмі балючыя і пякуць. Яны хутка лопаюцца, і на іх месцы ўтвараюцца эрозіі ці язвачкі, таксама балючыя. Часам нават немагчыма насіць споднюю бялізну: боль становіцца невыносным.

У адрозненне ад ВПЧ, які не цыркулюе ў арганізме, а пашкоджвае толькі плоскі эпітэлій, вірус герпесу жыве ў нервовых гангліях уздоўж пазваночніка. І пры зніжэнні імунітэту ён праяўляе сябе клінічна ў выглядзе высыпанняў. Перадаецца пры цесным кантакце, палавым шляхам, у тым ліку праз аральны і анальны сэкс.

Прафілактыка заражэння ВПЧ і вірусам герпесу — выкарыстанне прэзерватыва, у тым ліку для аральнага сексу.

— Ці можа вірус герпесу прыводзіць да раку шыйкі маткі?

— Герпес 1 і 2 тыпаў не мае ніякіх адносінаў да раку шыйкі маткі. Ёсць герпес 8 тыпу, які выклікае саркому Капашы, але гэта адбываецца часцей у ВІЧ-інфікаваных.

— Генітальны герпес лечыцца?

— На жаль, спосабу, каб знішчыць вірус герпесу раз і назаўсёды, не існуе. Герпес 1 тыпу можа перадавацца нават з пацалункам маці пры нараджэнні дзіцяці, і далей ён з чалавекам цягам усяго жыцця. А другі тып часцей перадаецца палавым шляхам. Цалкам іх знішчыць немагчыма, але можна падтрымліваць яго ў неактыўным стане з дапамогай лячэння супрацьвірусным прэпаратамі, якія пры хранічным генітальным рэцыдыўным герпесе прызначаюцца працягла, часам цягам года. Да гэтага дадаецца мясцовае супрацьвіруснае лячэнне. Таксама спатрэбіцца ўплывае ўмацаванне імунітэту, напрыклад, загартоўванне, здаровы лад жыцця, правільнае харчаванне, правільны рэжым працы і адпачынку і асабістая гігіена.

ЛЕТА ЯК МАЛЕНЬКАЕ ЖЫЦЦЁ

**Яно сыходзіць, але застаецца, як цёплы ўспамін.
Прыгадаем яго праз кадры Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белцветмет», Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 (**www.ipmtorgi.by**)

Предмет электронных торгов: транспортные средства с пробегом
Месторасположение:
Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово

№ лота	Наименование	Начальная цена с НДС, бел. руб.
1	**Грузовой бортовой МАЗ-6303А5**, р/зн. АН4441-5, 2013 г. в., инв. № 4300	**13 920,00**
2	**Прицеп бортовой MAZ-837810-(042),** р/зн. А 8599 А-5, 2010 г. в., инв. № 4020	**4 080,00**

Цена снижена на 50 %

С подробной информацией по предмету торгов можно ознакомиться на сайте организатора торгов **www.cpo.by**. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов
Условия оплаты предмета электронных торгов	100 % от цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение **10 рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 7 % от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

